Б 2272

Работніца і Калгасніца Беларусі

№ 9 (154)

# Часопісь „Работніца і калгасьніца Беларусі“ ў масы

## Змагацца за пяршынство ў конкурсе. Падцягнуць адсталыя раёны

У часе конкурсу рад раёнаў дабіліся пэўных зрухаў у справе распаўсюджаньня часопісі (Гомель, Віцебск, Слуцк, Рэчыца, Дрыса, Жлобін), разам з гэтым у цэлым радзе раёнаў, ня толькі не разгарнута ніякай працы па конкурсу, але дапушчана зьніжэньне той колькасьці падпішчыкаў, якія былі да конкурсу (Чачэрскі, Стара-Дароскі, Веткаўскі, Лепельскі, Буда-Кашалеўскі, Дубровенскі, Тураўскі, Бягомельскі).

Ганебна ў хвасьце конкурсу плятуцца—Чачэрскі раён—мае на сакавік 5 падпісчыц, Бягомельскі—10 падпісчыц, Нараўлянскі—12, Старобінскі—15, Чырвона-Польскі—15, Клічаўскі—16, Лельчыцкі—17, Буда-Кашалеўскі—18.

### Разгортваем сацспаборніцтва па распаўсюджаньні часопісі

Зьлёт ударніц Койданаўскага раёну шырока разгарнуў сацспаборніцтва і ўдарніцтва па распаўсюджаньні часопісі „Работніца і калгасьніца Беларусі“. Лукашэвіч — работніца МТС— абвясьціла сябе ўдарніцай па распаўсюджаньні і выклікала тав. Сьвірко (лесазавод). Тав. Сьвірко абавязалася распаўсюдзіць 50 экз. і выклікала ўдарніц саўгасу імя Сталіна, якія ўзялі на сябе абавязак распаўсюдзіць 90 экз. і выклікалі саўгас „Навасёлкі“. Тав. Сасонка (саўгас „Навасёлкі“),тав. Клышка (крэйдавы завод) абавязаліся распаўсюдзіць па 70 экзэмпляраў. К.

### Настаўніцы—актыўныя ўдзельніцы конкурсу

Я, настаўніца Дабрынёўскай школы, Рак З., у мэтах хутчэйшага прасоўваньня часопісі ў калгасныя масы, абавязваюся сабраць падпісчыкаў на часопісь „Работніца і калгасьніца Беларусі“ ня менш 100 экзэмпляраў і мабілізаваць на гэту работу вучняў. Выклікаю ўсіх настаўніц Койданаўскага раёну.

Рак.

Койданаўскі раён.

* * *

Мы, настаўніцы Рубілкаўскага сельсавету, Жакаўскай і Рубілкаўскай школ, Сушынская Я., Хаміч В., прымаем выклік настаўніцы Дабрынёўскай школы тав. Рак і абавязваемся завербаваць ня менш чым 100-гадавых і поўгадовых падпісчыкаў.

Сушынская, Хаміч.

Койданаўскі раён.

Тав. Ліпкіна—токар па мэталю лепшая ўдарніца. Сабрала падпіску па часопісь „Раб. і калг. Бел.“ 176 экз. (ф-ка Клары Цэткін, г. Віцебск).

### Конкурс разгортваецца

У Лёзьнянскім раёне разгортваецца конкурс па вярбоўцы падпісчыкаў на часопісь „Работніца і калгасьніца Беларусі“. Пытаньне конкурсу абгаворана на куставых зьлётах жанчын пры сельсаветах, разгорнута сацспаборніцтва паміж пунктамі, сельсаветамі і калгасамі, заключаны ўмовы на вярбоўку большай колькасьці падпісчыкаў.

Ударніца-калгасьніца Селязьнёва ўзяла на сябе абавязак завербаваць 150 падпісчыкаў у калгасе „Х Кастрычнік“ і ў сельсавеце.

Перадавыя ўдарніцы конкурсу—тав. Гурэвіч ужо завербавала 50 гадавых падпісчыкаў і Іванова завербавала 42 гадавых і 8 падпісчыкаў да канца пяцігодкі.

Узятая па самаабавязацельстве лічба—3 з паловай тысячы падпісчыкаў—будзе выканана. Толькі трэба, каб пошта лепш наладзіла дастаўку часопісі, а то несваячасовае атрыманьне часопісі тармозіць гэту справу.

В-а Ж.

### Лепшыя ўдарніцы—работніцы Жлобінскага раёну

З першага лютага гэтага году раён уключыўся ў конкурс па распаўсюджаньні часопісі „Работніца і калгасьніца Беларусі“. На ўсіх дэлегацкіх сходах прапрацаваны пытаньні аб ўдзеле ў конкурсе работніц і калгасьніц. Сябр гарсавету т. Соркіна сабрала 58 падпішчыц гадавых і паўгадовых, атрымала 11 руб. камісійных, з якіх унесла ў карысьць МОПР‘у 6 руб., а на 5 рублёў купіла пазыкі „3-ці рашаючы“. Тав. Нікіфарава — жонка рабочага чыгуначніка завербавала 43 падпісчыцы. Усе гэтыя таварышы прымаюць удзел ня толькі ў распаўсюджаньні друку, а і ў дапамозе падшэфным калгасам. Шырокі ўдзел прымалі ў ачыстцы насеньня. Праводзілі падворны абход па збору насеньня і г. д.

Работніцы - ўдарніцы заклікаюць работніц і калгасьніц і працоўных жанчын пасьледваць іх прыкладу, каб да 1-га красавіка давесьці падпіску на часопісь „Работніца і калгасьніца Беларусі“ па Жлобінскаму раёну на 1.000 экз. і дапамагчы калгасам у пасьпяховым правядзеньні 3-й бальшавіцкай вясны.

М.

* * *

Нарада сельскіх лістаносцаў Койданаўскага раёну і паштовых агенцтваў узяла на сябе абавязак распаўсюдзіць ня менш 1.000 экзэмпляраў часопісі „Работніца і калгасьніца Беларусі“.

К.

На вокладцы калгасьніца Грамовіч Зіна з калгасу Камінтэрн Койд. р. на практычных занятках у майстэрнях МТС.

# Арганізуем Усебеларускі рэйд ударніц часопісі „Работніца і Калгасьніца Беларусі“ па пытаньні праверкі падрыхтаванасьці да веснавой сяўбы

## Рабселькоркі-ўдарніцы часопісі, дэлегаткі, прымеце актыўны ўдзел у рэйдзе арганізуйце новыя ўдарныя брыгады імя 3-й калгаснай вясны. Дабецеся сваячасовай ссыпкі насеньня, рамонту інвэнтару, падрыхтоўкі кадраў і бытавых установ

Набліжаецца тэрмін веснавой сяўбы, аднэй з важнейшых гаспадарча-палітычных кампаній.

Рабселькоркі павінны актыўна змагацца за сваячасовую падрыхтоўку да 3-яй бальшавіцкай вясны, памятаючы, што ад гэтага залежыць выкананьне ўсіх задач веснавой пасеўнай кампаніі.

У часе падрыхтоўчай працы да вясны рабселькоркі, пад кіраўніцтвам партарганізацый, павінны арганізаваць работніц, калгасьніц і працоўных сялянак на выкананьне ўсіх мерапрыемстваў па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў; змагацца за пашырэньне плошчы тэхнічных культур, кармовых траў і сіласных культур; за падняцьце ўраджайнасьці збожжавых культур на 12 проц., тэхнічных—на 15 (на павышэньне ўраджайнасьці тэхнічных культур трэба зьвярнуць асаблівую ўвагу); за правільную расстаноўку рабочай сілы; за брыгаду, як асноўнае зьвяно калгаснай вытворчасьці; за ажыцьцяўленьне 6-ці ўмоў тав. Сталіна, як асноўнай прадпасылкі пасьпяховага выкананьня веснавой сяўбы. Асаблівую ўвагу зьвярнуць на аўладаньне тэхнікай сельскагаспадарчай вытворчасьці.

Засыпка семфондаў у калгасе.

Мы маем усе магчымасьці выканаць гэтыя задачы.

Барацьба за лепшы ўраджай, за павышэньне якасных паказальнікаў сельска-гаспадарчай вытворчасьці зьвязана з цэлым радам агратэхнічных мерапрыемстваў, якія патрэбна ажыцьцявіць у часе падрыхтоўчай працы да вясны і ў працэсе самой сяўбы.

Гэтыя мерапрыемствы наступныя: патрэбна ўстанавіць правільны севазварот у адпаведнасьці са спэцыялізацыяй кожнага саўгасу і калгасу. Правесьці 100 проц. ачыстку насеньня. Сваячасова абмяняць яго на гатункovае. Шырока скарыстаць усе віды ўгнаеньня (попел, мінэральныя ўгнаеньні, гной і інш.). Сваячасова зрабіць пратручваньне насеньня і праверку яго ўсхожасьці.

Рабселькоркі-ўдарніцы, разгарнеце сацспаборніцтва і ўдарніцтва на лепшае выкананьне ўсіх гэтых аграмерапрыемстваў у сваіх калгасах, саўгасах і ў аднаасобных працоўных гаспадарках, што забясьпесыць нам лепшы ўраджай. Арганізуйце ўдарныя брыгады імя 3-яй бальшавіцкай вясны, ўцягнеце новыя дзесяткі і сотні жанчын у гэтыя брыгады.

Лёзунг т. Сталіна аб аўладаньні тэхнікай павінен знайсьці сваю поўную рэалізацыю ў сельскай гаспадарцы.

Часопіс „Работніца і калгасьніца Беларусі“, пачынаючы з 10-га нумару (красавік месяц), зьмесьціць на сваіх старонках гутаркі для заняткаў гуртковў па вывучэньні тэхнікі вядзеньня тэхнічных культур (ільну і канапель).

Рабселькоркі-ўдарніцы, дэлегаткі, будзьце ініцыятарамі і арганізатарамі гэтых гурткоў у калгасах, саўгасах і пры хатах-чытальнях.

Дабівайцеся таксама арганізацыі жаночых вытворчых нарад у тых галінах, дзе пераважна працуюць жанчыны.

Матар'ялы рабселькорак сыгналізуюць, што ў радзе месц падрыхтоўка да вясны разгортваецца марудна. Больш слабым месцам зьяўляецца ссыпка насенных і страхавых фондаў, слаба мабілізуюцца для гэтага ўнутраныя рэсурсы калгасаў. Зацягваецца рамонт інвэнтару і сельскагаспадарчых машын, расстаноўка рабочай сілы ня ўсюды праведзена.

Рашаючым і асноўным мерапрыемствам у выкананьні пляну бальшавіцкай вясны зьяўляецца стварэньне насенных фондаў. Для гэтай мэты шырока павінны быць скарыстаны ўнутраныя рэсурсы саміх калгасаў. Гэта можна зрабіць, разгарнуўшы масавую працу сярод калгасьнікаў, калгасьніц і аднаасобнікаў вакол гэтага пытаньня.

Трэба скарыстаць вопыт Паўночнага Каўказу—распаўсюджаньне насеннай пазыкі. (Аблігацыі насеннай пазыкі можна атрымаць у рэдакцыі раённай газэты). Апрача насеннай пазыкі, якая мабілізуе ўнутраныя рэсурсы самога калгасу, трэба шырока папулярызаваць і разгарнуць міжкалгасныя і міжраённую пазыкі насеньня і сацыялістычны абмен насеньнем паміж калгасамі і раёнамі. Асаблівую ўвагу ў часе збору насеньня трэба зьвярнуць на збор тэхнічных культур і кармовых траў.

Рабселькоркі-ўдарніцы, будзьце арганізатарамі ўдарных брыгад па распаўсюджаньні насеннай пазыкі і праверцы захаванасьці ўжо сабранага на-

(*Канец глядзі на 2-й старонцы*).

# ВУЧЭЦЕСЯ У ПЕРАДАВІКОУ

## Узялі на буксір суседні калгас па зборы насеньня

Падрыхтоўка да трэцяй бальшавіцкай сяўбы ў калгасе „Случ“ праходзіць бальшавіцкімі тэмпамі. У працы актыўны ўдзел прымаюць калгасьніцы-ўдарніцы. У часе сьвята 8-га сакавіка складзена жаночая ўдарная брыгада ў колькасьці 28 чалавек па пасьпяховым правядзеньні трэцяй калгаснай вясны і ссыпцы насеннага фонду. Насенныя фонды ссыпаны, калгас забясьпечан насеньнем на 100 проц.

Калгасьніцы па-бальшавіцку змагаюцца за лепшую падрыхтоўку да сяўбы праз актыўны ўдзел у штодзенцы калгасу „За бальшавіцкія тэмпы“, бяруць удзел у рэйдах, якія праводзіць штодзенка.

Сельскагаспадарчы інвэнтар і машыны адрамантаваны поўнасьцю, ліквідавана абязьлічка. Усе калгасьнікі і калгасьніцы разьбіты на брыгады па вытворчым прынцыпе. Усё гэта зроблена пры самым актыўным удзеле калгасьніц-ударніц.

Зараз калгас па ініцыятыве штодзенкі распаўсюджвае насенную пазыку сярод калгасьнікаў. Калгас „Случ“ узяў на буксір суседні калгас, каб дапамагчы яму ў гэтай справе.

Калгасьніца.

Слуцкі раён.

## Бярэце прыклад з „Чырвонай Вясеі“

Калгас „Чырвоная Вясея“, Прошчыцкага сельсавету (Слуцкі раён) дабіўся вялікіх посьпехаў у падрыхтоўцы да сяўбы і арганізацыі працы.

Усе калгасьнікі разьбіты на брыгады. Брыгады арганізаваны на вытворчым прынцыпе. Брыгадзірамі вылучаны лепшыя калгасьнікі ўдарнікі. Кожная брыгада адказвае за падрыхтоўку да сяўбы на сваім вучастку. Клопаты аб насеньні, аб рамонце інвэнтару сталі ня толькі справай праўленьня, а і брыгады і кожнага калгасьніка. У выніку гэтага насенныя фонды мы цалкам ссыпалі. Рамонт сельскагаспадарчага інвэнтару скончылі да 1-га сакавіка. Стварылі браніявана-фуражны фонд. Складаньне вытворча-фінансавага пляну закончылі да 20-га лютага і дэтальна абгаварылі на пасяджэньні праўленьня, актыве і агульным сходзе.



Ударніцы-калгасьніцы ў трыера (саўгас „Івань“ Слуцкі раён).

Абгаварваючы на агульным сходзе вытворча-фінансавы плян, калгасьнікі высунулі сустрэчны: 2 *га* ільну, 7 *га* бульбы і 1 *га* гароху. Сяўбу-ж абавязаліся скончыць за 15 дзён. Калгасьнікі абвясьцілі сябе ўдарнікамі веснавой сяўбы.

Усе калгасы Случчыны павінны раўняцца па калгасе „Чырвоная Вясея“.

Шпакоўскі.

## 11 новых заяў у партыю Леніна

Ударніцы гораду Веткі сабраліся сьвяткаваць сваё сьвята 8-га сакавіка, падзяліцца вопытам сваёй працы, адзначыць працу лепшых.

12 лепшых ударніц калгасных палёў прэміявалі прамтаварамі, тут-жа на сходзе ім выдалі кніжкі ўдарніц.

У прэзыдыўм сходу паступіла 11 заяў аб прыёме ў партыю.

Да дня 8-га сакавіка падрыхтавалі 16 чырвоных сёстраў.

Вылучылі брыгады па зборы насенных і фуражных фондаў.

Шымук.

---

*(Канец артыкулу аб рэйдзе).*

сеньня. Разгарнеце папулярызацыю насеннай пазыкі сярод працоўных жанчын. Пастаўце і абгаварэце гэта пытаньне на вытворчых нарадах, на сходах брыгад, на агульных сходах калгасьніц, саўгасьніц і аднаасобных сялянак.

Часопісь „Работніца і калгасьніца Беларусі“ пачала рэйд праверкі падрыхтаванасьці да веснавой сяўбы. Абавязак кожнай рабселькоркі і ўдарніцы часопісі ўключыцца ў гэты рэйд, для чаго арганізаваць ударныя брыгады часопісі, якія ня толькі правераць падрыхтаванасьць да веснавой сяўбы, але і дапамогуць калгасам і саўгасам у правядзеньні гэтай важнейшай гаспадарча-палітычнай кампаніі.

Брыгады павінны шырока асьвятляць у часопісі і ў сваім насьценным і раённым друку ўвесь матар'ял, выяўлены ў часе рэйду.

Рэдакцыя заклікае ўсіх рабселькорак і ўдарніц друку прыняць актыўны ўдзел у рэйдзе.

Вось прыкладны пытальнік для брыгад рэйду:

1. Ці даведзены пасеўныя пляны да кожнай брыгады, рабочага, калгасьніка і аднаасобнай гаспадаркі.

2. Ці ссыпаны насенныя, страхавыя і фуражныя фонды, ці скончана ачыстка насеньня, ці зроблен абмен на гатунковае насеньне.

3. Як стаіць справа з рамонтам машын, інвэнтару і збруі.

4. Ці разьбіты калгасьнікі на брыгады, ці праведзена прымацаваньне да брыгад вучасткаў зямлі, машын і інвэнтару, ці распрацаваны нормы працы, ці падрыхтаваны кадры брыгадзіраў.

5. Якія гурткі па аўладаньні тэхнікай ёсьць у саўгасе, калгасе і хаце-чытальні. Які процант жанчын у складзе гэтых гурткоў. Ці ёсьць жаночыя вытворчыя нарады і як яны працуюць.

6. Як падрыхтаваны бытавыя ўстановы да веснавой пасеўнай кампаніі.

7. Якія вынікі даў пробны выезд у поле.

8. Як разгорнута масавая праца з жанчынамі ў сувязі з падрыхтоўкай да сяўбы.

Рэдакцыя.

# Камуна „Іскра Леніна“ па баявому рыхтуецца да вясны

На руінах старога капіталістычнага ладу і на абшарах панскай зямлі ў Шуменскім сельсавеце, Віцебскага раёну, у 1923 годзе нарадзілася камуна „Іскра Леніна“.

5 байцоў грамадзянскай вайны пераключылі свае сілы на фронт пабудовы новай сацыялістычнай гаспадаркі, новага сацыялістычнага грамадзтва.

Панская сядзіба была разбурана, сцены драўлянага дому былі бяз вокан, будынкі без дзьвярэй і варот. Зямля была запушчаная, двор зарос травою, сад у 40 *га* прападаў бяз догляду.

Вось у такіх абставінах пяць маладых камунараў пачалі будаваць новае жыцьцё, рамантаваць раскіданыя старыя будынкі, уздымаць панскія аблогі і асвойваць новыя землі, заросшыя кустамі.

У красавіку 1932 году камуна „Іскра Леніна“ будзе сьвяткаваць сваё першае дзесяцігодзьдзе За дзесяць год зусім зьмяніўся твар абшарніцкай сядзібы, па-новаму выглядаюць старыя панскія будынкі, а побач з імі моцнымі рукамі камунараў пабудаваны новыя жылыя памяшканьні і іншыя будынкі.

Зараз у камуне 40 батрацкіх, бядняцка-серадняцкіх сем'яў. Цяпер ужо ня пяць, а 155 камунараў, у тым ліку рабочых мужчын—45, жанчын—42, рэшта дзеці і старыя,

Чатыры камунары вылучаны на адказныя кіруючыя пасады. Адзін з іх зьяўляецца дырэктарам фанэрнай фабрыкі ў горадзе Віцебску. Адзін з вэтэранаў камуны тав. Казанаў вось ужо 9 гадоў як зьяуляецца бязьменным старшынёй камуны. З энтузіязмам глядзіць ён на пабудаваную магутную фабрыку мяса і малака—МТФ.

На раскарчаваным вучастку зямлі ў 24 *га* пасаджан новы малады сад. Сад добра даглядаецца. Камуна мае 600 *га* ворнай зямлі, 39 рабочых коняй, 118 дойных кароў, 80 штук цялят, 23 сьвіней. Пабудавана абора на 1000 галоў, праводзіцца ўкамплектаваньне МТФ.

У камуне арганізаваны гурткі па вывучэньню агратэхнікі. Ліквпункты дрэнна наведваюцца за вычлючэньнем Маланьні Купрынковай, якая за 3 месяцы ліквідавала сваю няпісьменнасьць, з гонарам выканала ўзяты абавязак на ўсебеларускім зьезьдзе калгасьніц.

Сацспаборніцтвам і ўдарніцтвам ахоплена толькі 8 камунарак, якія сапраўды змагаюцца за сацыялістычныя мэтады працы. Лепшыя з іх—тав. Кавалёва Афрасіньня, адказная за сьвіней, выпрацавала 420 працадзён у 1931 годзе, тав. Волкава Натальля—старэйшая даярка—выпрацавала 403 працадні, т. Ясь-

Вывазка штучнага ўгнаеньня.

кіна Антаніна—55 год—сьвінарка—выпрацавала 420 працадзён і г. д. Усе гэтыя ўдарніцы прэміяваны па некалькі раз.

Але-ж ёсьць у камуне і такія жанчыны, якія за два гады ні аднаго дня не працавалі, як камунарка Селязьнёва Эмілія. Камунарка Качанава—жонка загадчыка МТФ—за год выпрацавала 30 працадзён. Таму, калі праходзіла разьмеркаваньне воўны, то яна патрабавала, каб разьмеркавалі не па працаднёх, а па едакох.

У часе ачысткі насеньня спачатку ня былі складзены брыгады, ачышчалі ў дзень 39 пудоў. Калі праўленьне сумесна з насьценнай газэтай зьвярнулі ўвагу на марудныя тэмпы па ачыстцы насеньня, зараз-жа правялі растлумачальную працу сярод камунараў, мабілізавалі грамадзкасьць стварылі ўдарныя брыгады. Ударніцы Іванова Феня і Цялышова Волька ў дзень ачышчалі па 60 пудоў.

У 3-ю бальшавіцкую вясну камуна павінна дабіцца рашучага пералому ў справе падняцьця ўраджайнасьці. Падрыхтоўка да вясны ў камуне падыходзіць да канца, насеньне ачышчана, у асноўным насеньнем забясьпечаны, няма толькі некаторых гародніх культур—гуркоў і капусты. Рамонт інвэнтару заканчваецца. Інвэнтар і цягавая сіла прымацаваны да кожнага камунара, працоўная сіла разьбіта на брыгады, улік працы добра пастаўлен, вядзецца насьценны месячны табэль для таго, каб кожны калгасьнік мог праверыць, як правільна ўлічылі працадні.

Па ўсіх відах працы ўжываецца зьдзельшчына з улікам працы ў працаднёх. Зараз камуна рыхтуецца адкрыць ясьлі, у чым ёй аказаў грашовую дапамогу Чырвоны крыж.

Камуна ўключылася ў конкурс, абвешчаны „Правдой“. Насьценгазэта выходзіць кожныя тры дні. Яна зьяўляецца магутнай зброяй пралетарскай крытыкі.

Разам з дасягненьнямі ёсьць у камуне і адмоўныя бакі. У сталоўцы пануе абязьлічка, бруд, дым, антысанітарнае становішча.

У камуне зусім адсутнічае культурна-масавая работа сярод жанчын, слаба разгорнута сацспаборніцтва і ўдарніцтва.

Праўленьне камуны разам з насьценгазэтай павінна мабілізаваць грамадзкасьць на ліквідацыю прарываў, якія яшчэ ёсьць. Толькі пры дапамозе ўсіх камунараў і камунарак „Іскра Леніна“ дабіецца яшчэ большых посьпехаў, якія пастаўлены партыяй і савецкай уладай у 3-яй бальшавіцкай вясьне. Грумбіна.

## Сабралі 280 пудоў

У мястэчку Прапойску дэлегацкі сход калгасьніц калгасу „Кастрычнік“ вылучыў брыгаду па ачыстцы насеньня і па зборы попелу, брыгада за тры дні сабрала 280 пудоў попелу.

Дэлегацкі сход калгасьніц выклікаў на сацспаборніцтва на лепшую падрыхтоўку да сяўбы дэлегацкія сходы Чавускага і Чэрыкаўскага раёнаў.

Калечкава П.

# 7 кілёмэтраў ад мяжы

(*Саўгас „Негарэлае“ Койданаўскага р.*)

Цёпла. Сонейка прыгрела стрэхі, сасулькі ў поўдзень пачынаюць раставаць. Лёгкі вецярок вее з Усходу, фарбуючы здаровыя твары дзяўчат, што працуюць на „фабрыцы мяса“.

— Куды, юсь, на месца, ласкава пакрыкваючы, гукае сьвінарка Ксеня Тарбэцкая, бегаючы за здаравенным пародзістым кныром.

Ксеня камсамолка — лепшая ўдарніца, некалькі разоў прэміявана. Ксеня стараецца, каб у яе цэху быў парадак, каб сьвіньні былі на сваім месцы, а ня дзе небудзь.

Сьвінаркі саўгасу актыўна змагаюцца з адыходам маладняка. Уелася ўсім эпіозотыя, а горш за эпіозотыю абязьлічка. Ніхто ні за што не адказваў, ні за адыход, ні за санітарыю. Такі парадак меў свае вынікі. З двухсот шгук маладняка жывымі заставалися толькі 10. Так было...

Зараз гэтага няма. Увядзеньне сапраўднай зьдзельшчыны забясьпечыла пералом. Устаноўлены нормы догляду. Па 200 шгук матак даглядае кожная сьвінарка, павысіўся і заработак. Калі раней сьвінарка зарабляла 27 рублёў, самае большае 30 рублёў, дык зараз 60—70 руб. Ударніцы Тарбэцкая Ксеня, Стэльмах Вольга, Віткоўская Зося выраоляюць нават больш.

Адыход даведзен да мінімуму. Ноччу ў сьвінарніку ўстаноўлены дзяжурствы, каб апаросы не адбываліся бяз догляду. Парасныя маткі, асабліва трымаюцца ў чыстаце. Тут шмат дапамагае вытворчая нарада саўгасу.

Каб ня было хаосу ў апаросах патрэбна, каб злучная кампанія прайшла ў тэрмін. Плян злучной кампаніі ў саўгасе перавыканан. Патрэбна было пакрыць 212 матак, пакрыта 262.

**Плян здачы таварнай прадукцыі таксама выканан з перавышэньнем.**

***

Уласная электрастанцыя забясьпечвае электраэнэргіяй саўгас. Пабудавана новая кухня, якая цалкам мэханізавана. Бульба варыцца ў катлох парай, ёсьць спэцыяльная бульбамыйка, ваду грэюць таксама парай. Зараз думка вынаходцаў працуе над вынаходкай спосабу мэханічнага таўкача, каб і тут ня ўжываць фізычнай сілы. Ад кухні да сьвінарнікаў праведзены рэйкі, па якіх бульба і наогул кармы паступаюць у другі цэх — у сьвінарнік.

Ня дрэнна наладжана культабслугоўваньне саўгасу. Ёсьць клюб, які наведвае галоўным чынам моладзь. Кіно мае асобны будынак, і раз у тыдзень паказвае саўгасьнікам апошнія дасягненьні аграномі, што з ахвотай ідуць глядзець саўгасьнікі. **Сталоўка чыстая і сьветлая,** нават з трумо (люстра), **абеды добраякасныя.**

Пабудаваны новыя ясьлі, якія ў веснавую сельскагаспадарчую кампанію будуць мець рашаючае значэньне ў забесьпячэньні саўгасу рабочай сілай.

У цэнтры — партком і селькамітэт ЛКСМБ. Ёсьць недалёка ад саўгасу лесапільны камбінат, і там-жа двухпавярховы дом для рабочых; пабудаваны новыя сьвінарнікі, аборы, стайні—і ўсё гэта толькі за год.

— Трэба яшчэ шмат працаваць— кажа т. **Шчакалаў,** чырвоны дырэктар саўгасу, трэба пашырыць будаўніцтва, камплектаваньне стада і шмат чаго іншага трэба яшчэ зрабіць.

К.



Сталоўка саўгасу „Негарэлае“

Вылучэнка зоотэхнік т. Барысенка з саўгасу „Негарэлае“

## Працоўныя жанчыны ня ўцягнуты ў падрыхтоўчую работу да вясны

У Бяседавіцкім сельсавеце, Касьцюковіцкага раёну, калгасьніцы і працоўныя сялянкі да гэтага часу ня ўцягнуты ў правядзеньне гаспадарча-палітычных кампаній. Ні сельсаветы, ні партячэйка ніякай палітычна-выхаваўчай працы сярод іх не праводзяць.

Пастановы XIV зьезду КП(б)Б і XVII канфэрэнцыі ЎсеКП(б) не прапрацоўваюцца.

**У падрыхтоўчую работу да веснавой пасеўнай жанчыны ня ўцягнуты.** У выніку адсутнасьці масавай працы ўсе дэлегацкія сходы разваліліся. На ўвесь сельсавет выпісваецца толькі 5 экзэмпляраў часопісі „Работніца і калгасьніца Беларусі“. Аб конкурсе на лепшае распаўсюджаньне нашай часопісі ніхто ня ведае.

**Парт'ячэйка і сельсавет павінны зараз-жа разгарнуць работу сярод працоўных жанчын і мабілізаваць іх на выкананьне задач 3-яй бальшавіцкай вясны.**

Ф. Лупікаў.

# Што расказваюць жаноргі аб падрыхтоўцы да веснавой сяўбы

*(На нарадзе пры ЦК КП(б)Б)*

### Тав. Валеніс (*Полацкі раён*)

— Саўгас „Батонь“ мае 2.936 гэктараў пахаці, ухіл жывёлагадоўчы, сьвіней племянных—2.876 шт., сьвінаматак — 800, пасеўная плошча павялічана на 7 проц., рамонт інвэнтару і транспарту скончан, трактараў ёсьць 7 штук, не хапае паводле пляну 2 трактараў.

У 1931 годзе зазяблена 73 проц. плошчы, гною вывезена 50 проц. У мінулым годзе адыход парасят складаў 42 проц., зараз значна зьменшыўся. Саўгас узяўся за падрыхтоўку кадраў. Ёсьць курсы жывёлагадоўчыя, трактарныя і агратэхнікі, якімі ахоплены 143 асобы, з іх 50 проц жанчын. Ударніцтвам ахоплена па саўгасе 50 проц. Да 8-га сакавіка 6 жанчын прэміяваны за добры догляд жывёлы і падрыхтоўкў да сяўбы.

Па горадзе Полацку жонкі вайсковых сабралі 160 руб. на адчыненьне ясьляй у падшэфным калгасе пад час сяўбы. У Полацкім раёне сёлета намечана адкрыць 100 ясьляй, з іх 80 часовых і 20 пастаянных.

### Тав. Ханенка (*Рагачоўскі раён*)

— Праведзен раённы зьлёт калгасьніц і аднаасобніц па пытаньнях веснавой сяўбы, на зьлёце былі створаны 8 жаночых брыгад па 7 асоб у кожнай брыгадзе па падворным абходзе для збору насеньня.

У Гарадзецкім сельсавеце, у калгасе „Свабода“ створана брыгада з 9 калгасьніц па вывазцы гною, якая сама скончыла гэту працу. Калгас „Камінтэрн“, Гарадзецкага сельсавету, прапрацаваў пастанову Калгасцэнтру СССР і пастанову ЦК КП(б)Б аб арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў. Складзена брыгада з 6 асоб па дэтальнай расстаноўцы рабочай сілы.

Дэлегацкі пункт прамкааперацыі ўзяў шэфства над калгасам „Зьвязда“ па пасьпяховым правядзеньні веснавой сяўбы і культурным абслугоўваньні калгасьнікаў. Шэфы адкрываюць дзіцячыя ясьлі. Дэлегацкі пункт грамадзкага харчаваньня сабраў 57 руб. на падводную лодку „Ваяўнічы бязбожнік“.

### Тав. Сядзінкіна (*Лельчыцкі раён*)

— Калгас „Кастрычнік“ раней выдаваў корм бяз усякага ўліку, а зараз недахват корму. Жанчыны-калгасьніцы ўнесьлі на вытворчай нарадзе прапанову па эканоміі кармоў. У гэтым-жа калгасе пабудован сьвінарнік, але-ж вады блізка няма, і жанчынам прыходзіцца насіць яе здалёк.

### Тав. Хмялеўская (*Чырвонапольскі раён*)

Зоатэхнікі не вядуць уліку прыросту і адыходу сьвіней. Калі за адну ноч загінула 26 парасят і запыталі ў зоатэхніка пра гэты выпадак, дык ён адказаў, што ня ведае, як гэта здарылася.

### Тав. Яфрэменка (*Чачэрскі раён*)

— У нас складзены жаночыя брыгады для правядзеньня ўліку ўсяго маладняка як па калгасным, так і па аднаасобным сэктары раёну. На 10 III па раёне ссыпана насеньня 80 проц., тэхнасеньня — 45 проц.

### Тав. Каган (*Камарніцкі раён*)

— Наш раён па пляну быў вызначан як жывёлагадоўчы, калі-ж на 50 проц. былі скончаны сьвінарнікі, то атрымаўся новы плян па ўхіле тавара-малочным. Няма выразнага ўказаньня з боку райкалгассаюзу аб спэцыялізацыі раёну, частыя зьмены пляну адбіваюцца на працы.

### Тав. Бярозкіна (*Горацкі раён*)

— У калгасе „Пясочны“, Гурылаўскага сельсавету жанчыны—дэлегаткі 8 га сакавіка арганізавалі брыгаду па здачы ільну дзяржаве. На чале гэтай брыгады была Кавалёва Матруна—бяднячка. Па ініцыятыве калгасьніц-дэлегатак, якія зьвярнулі ўвагу на дрэнную якасьць насеньня, якое часткова згніло, была складзена брыгада па пераборцы бульбы.

### Тав. Пятрова (*Чавускі раён*)

— Саўгасьніцы саўгасу „Ялова“ сабралі вялікую колькасьць попелу, з посьпехам праходзіць ачыстка насеньня. У Амхоўскім сельсавеце вёскі Новасёлкі жанчыны-калгасьніцы ў сьнежні знайшлі схаваную кулацка-варожым элемэнтам бульбу у колькасьці 150 пудоў. Бульба была схавана на могілках замест нябожчыка.

У горадзе Чавусах скончыла лікпункт 12 жанчын, якія былі прэміяваны за пасьпяховую вучобу.

### Тав. Фэйгіна (*Заслаўскі раён*)

— Наш раён скончыў рамонт інвэнтару па МТС, за кожным калгасьнікам прымацован інвэнтар. Пастаяннага ўліку ўдарнікаў па калгасах няма. Па мабілізацыі сродкаў у трэцім кварталe Заслаўскі раён занесен на чырвоную дошку.

### Тав. Паўлючэнка (*Жлобінскі раён*)

Члены ячэйкі Асоавіяхіму чыгуначнікаў узялі абавязак—дапамагчы падшэфнаму калгасу ў правядзеньні сяўбы, рабіць выезды ня менш двух раз у месяц. Канчаткова ліквідаваць да 1 чэрвеня 1932 г. ваенна-хэмічную няпісьменнасьць. Дэлегацкі пункт станцыі Жлобін заключыў умову з праўленьнем жлобінскай прыгараднай гаспадаркі па паляпшэньні працы гаспадаркі. У часе веснавой сяўбы пастанавілі адпрацаваць па 5 дзён у месяц у прыгараднай гаспадарцы.

Работніца саўгасу імя тав. Гея, тав. Крывецкая — батрачка — працуе па доглядзе сьвіней. Адыход маладняка раней даходзіў да 50 проц., а зараз 68 проц. У дзень 8-га сакавіка яна была прэміявана. Яна ўзяла на сябе абавязак зьнішчыць зусім адыход маладняка, працаваць добрасумленна ў саўгасе і надалей.

# У барацьбе за 3-ю бальшавіцкую вясну

Зусім нядаўна пачала выходзіць газэта „Наш шлях“ калгасу „Камунар“ (Рубілкаўскі сельсавет, Койданаўскі раён), але яна ўжо пасьпяхова мабілізуе калгасьнікаў вакол пытаньняў арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасу і падрыхтоўкі да веснавой сяўбы.

Газэта з першых-жа нумароў пачынае біць прагульшчыкаў, якія зрываюць працу на МТФ і ў іншых галінах гаспадаркі. Вось прыклад допісу, зьмешчанага ў газэце „Біць трывогу“.

„На пункце Сухадол **Мілашэўская** Ганна хацела сарваць догляд жывёлы. Яна нагаворвала, каб зьняць са скотнага двара тых рабочых, якія сумленна працуюць, як Клімовіча і Шацілу. Сама-ж працаваць зусім ня хоча. Калі яе паставілі на скотным дварэ, то яна прапрацавала два дні і кінула, тлумачачы тым, што ёй не далі бацінак. У выніку гэтага Мілашэўская зволена з працы, палепшыўся догляд жывёлы, укамплектавана 451 штука жывёлы“.

Газэта таксама змагалася за хутчэйшую і сваячасовую апрацоўку ільну, за правільнае прэміяваньне тых, хто ўдарна працуе.

Газэта і селькоры апэрацыйна змагаліся за загатоўкі, у выніку калгас „Камунар“ перавыканаў пляны загатовак. Па ільнасемяні заданьне—40 цэнтнэраў, выканана 768 цэнтнэраў, па мясу—заданьне 10 штук, выканана—37, па збожжавым заданьне—728 цэнт., выканана—768 цэнт.

Яшчэ большую апэрацыйнасьць газэта праявіла ў працы па падрыхтоўцы да веснавой сяўбы. У студзені, калі калгас яшчэ і ня думаў рыхтавацца да сяўбы, газэта ўжо пісала аб неабходнасьці гэтай падрыхтоўкі.

Газэта ня толькі сыгналізавала, яна і арганізоўвала, былі створаны брыгады селькораў па праверцы падрыхтоўкі да сяўбы.

Кіраўніцтва калгасу рэагавала на зьмешчаны матар'ял. Зрушылі з мёртвага пункту рамонт, які ўжо амаль увесь закончаны. Насеньне ўсё ачышчана. Вывазка гною пайшла шпаркімі тэмпамі. Складзен вытворча - фінансавы плян, які прадугледжвае пашырэньне пасеўнай плошчы на 20 гэкт.

Вось вынікі бальшавіцкай працы газэты, якая ня толькі словам, але і справай ўмацоўвае калгас, рыхтуе яго да сяўбы. Зьлёт селькораў і селькорак калгасу ўхваліў да першага сакавіка падрыхтаваць пробны выезд у поле.

Недахопам газэты зьяўляецца тое, што адсутнічае паказ узораў работы, якія бязумоўна ёсьць у калгасе і маюць вялікае выхаваўчае значэньне. Некаторыя, зьмешчаныя ў газэце заметкі застаюцца без рэагаваньня.

Больш работы з селькорамі, яшчэ большае разгортваньне работы па конкурсе „Правды“, баявая падрыхтоўка да сяўбы—вось комплекс бліжэйшых задач газэты „Наш шлях“.

К.

# Перабудаваць працу саўгасу імя Сталіна

Увядзеньне гаспадарчага разрахунку ў саўгасе імя Сталіна (Койданаўскі раён) узьняло прадукцыйнасьць і якасьць працы. **Брыгада № 1 Абухоўскай, якая складаецца з 5 чалавек, перайшла на гаспадарчы разрахунак. Замест 100 сьвіней, як гэта сказана ў дагаворы, брыгада даглядае 110.**

Трэба адзначыць, што дагавор вельмі часта зрываецца з боку адміністрацыі.

Ударніца брыгадзіркa Холадзь выносіць барану для пробнага выезду ў поле.

У сьвінарніках тэмпэратура часта дасягае 8—10 градусаў холада ў той час, як ёсьць печы, якіх ніколі не паляць. Вільготнасьць, якую можна лёгка зьнішчыць, тут надзвычайна вялікая.

Вада падвозіцца несваячасова, а таму і кармленьне адбываецца зусім позна. Кармы не камбінуюцца. Усё гэта вядзе да захворваньняў.

Рацыяналізатарскія прапановы, якія даваліся сьвінаркамі, не рэалізуюцца. Усе гэтыя недахопы могуць быць лёгка зьнішчаны пры правільнай арганізацыі мас сьвінарак на іх зьнішчэньне і пры большай паваротлівасьці адміністрацыі, у якой у гэтых адносінах недапушчальна — чарапашыя тэмпы.

Пару слоў аб бытавых умовах. Сталоўка саўгасу — прыклад бруду і безгаспадарчасьці. Падлога ніколі ня маецца, дзьверы не зачыняюцца, якасьць абедаў нікуды ня годная, хоць прадукты ёсьць і можна прыгатаваць лепш. Інтэрнат, дзе жывуць сьвінаркі, не атапляецца.

Зусім кепска пастаўлена ў саўгасе масавая праца сярод жанчын. Ёсьць дэлегацкі пункт з 23 дэлегатак, але-ж ні сельпартком, ні цэхавыя ячэйкі ня кіруюць яго працай. Ліквідацыя няпісьменнасьці сярод работніц зусім адсутнічае. Гэта тлумачаць аб'ектыўнымі прычынамі, як адсутнасьць памяшканьня, лямпы і інш.

У выніку ігнараваньня з боку парткому антырэлігійнай работы з работніцамі, ёсьць выпадкі прагулаў у рэлігійныя сьвяты.

Мала работніц ахоплена палітвучобай, слабы ўдзел яны прымаюць у друку. Праца з рабкорамі зусім не разгорнута. Сельпарткому і адміністрацыі неабходна зьвярнуць асаблівую ўвагу на рэалізацыю 6-ці ўмоў т. Сталіна ў саўгасе і на разгортваньне культ-выхаваўчай масавай работы сярод саўгасьніц.

Г.

# СПРАВА ГАННЫ КОЎТС

*(З-за кардоннай прэсы)*

У Лёнданскім судзе разглядаюць справу Ганны Коўтс, якую абвінавачваюць у забойстве свайго ўласнага дзіцяці. Падсудная яшчэ маладая, але бяз часу пастарэлая жанчына з палінялымі вачыма, слухае няўважліва вінаваўчы акт, аглядае судзьдзяў і публіку. Абвінаваўчы акт, мусіць, яе зусім ня цікавіць. На запытаньне, ці вінавата яна, Коўтс вяла прызнае віну.

— Падсудная,—зварачаецца да яе старшыня, — раскажэце, як здарылася забойства. Што прымусіла вас забіць сваё ўласнае дзіцянё?

Падсудная маўчыць.

— Ды вы ня бойцеся. Засядацелі прымуць пад увагу ўсе абставіны.

Падсудная і далей маўчыць.

— Чаму-ж вы ня хочаце прызнацца суду,—ужо сурова гаворыць старшыня,—што прымусіла вас забіць дзіця. Я не разумею вашага маўчаньня.

Падсудная нібы адарваўшыся ад нейкіх думак, прамовіла:

— Што там расказваць. Ну, зрабіла і—зрабіла...

— Але чаму? З якіх прычын? Вы-ж кахалі свае дзіця? Праўда-ж кахалі?

Падсудная:

— Лепш ужо ня мучайце, а хутчэй засудзеце.

Алзін з засядацеляй дапытваецца, ці каецца падсудная за свой учынак.

Падсудная маўчыць. У залі рух.

Абаронца лічыць патрэбным умяшацца. Ён палка і цярпліва даводзіць падсуднай, што могуць падумаць нібы ў ёй і раскаяньня няма. Але-ж на справе ня так. Праўда-ж? Яна-ж шкадуе, што так зрабіла?—Падказвае абаронец.

Падсудная ўсё маўчыць.

— Кажэце-ж,—хвалюецца абаронца.—Сваімі паводзінамі вы сябе загубіце. Кажэце,—і дабрадзеі-засядацелі зразумеюць, што ня з жорсткага сэрца вы забілі дарагое вам дзіця і зьміласьцівяцца над вамі.

Падсудная ў часе прамовы пачынае хвалявацца.

— Ня трэба м е іх міласьці. Дзе былі ўсе гэтыя людзі, калі з дзіцем на руках я абівала парогі, згаджаючыся на любую працу. Тады са мною і гаварыць ніхто не хацеў, ніхто не зьмілаваўся. Цяпер ужо ня трэба мне міласьці і жыцьця мне ня трэба. Але, бач, тым паном цікава, як і чаму я забіла сваю каханую дзяўчынку. Добра. Я дакладна раскажу, але не для паноў, якім няма да мяне справы, А для іншых небарак матак. Хай яны ня робяць так па-дурному, як зрабіла я.

Слухайце, справа звычайная. Чалавек мой надарваўся ў працы і захлынуўся ў сваёй уласнай крыві. Я засталася з малым дзіцем і даўгамі. Бо тое, што зарабляла я з чалавекам не дазваляла жыць без даўгоў. Калі чалавек памёр, я пайшла на фабрыку, але мне ў працы адмовілі з прычыны скарачэньня вытворчасьці. Два месяцы бегала я па фабрыках. Была ва ўсіх крамах, канторах, шукаючы работы. Але нідзе нічога не знайшла. З кватэры выгналі. Куды ісьці? Што рабіць? Быў вечар. Я закутала дзяўчынку ў анучы і парашыла ісьці да сваёй цёткі на сяло за 75 міль. Ішла цэлы дзень, дзіця галоднае, мяне ногі ня трымаюць. Пачала прасіць міласьціну. Ніхто ня даў. Зусім выбілася з сіл. Галоднае дзіця, зьнясіліўшыся ад крыку, заснула. Я паклала яго на лаўку нейкага будынку сама села і думаю. Успомніла цяжкую долю—работу з цяці год, голад, галечу, холад у доме. Потым з 13 ці год шасталася па людзях, цяжкая работа на фабрыцы. У добрых гаспадароў сабаку лепш жывецца. Потым замуж, невялікая радасьць, тры галодных гады—і кропка. У 30 год і я ўжо стала старою бабаю. Так я сядзела і разважала. Хіба-ж гэта жыцьцё? Навошта жыць, калі дзень у-дзень сядзіш галодным. І такое жыцьцё было прызначана майму дзіцяці. Няўжо-ж так будзе? А чаму-ж не? Хіба-ж навокал мяне лепш жывуць, чым я? Колькі пакуты, голаду і мукі. Я, здаецца, задрамала, бо ня чула, як прачнулася дзіця і пачало крычаць. Нейкі праходжы разбудзіў мяне. Я ўзяла дзіця на рукі і падалася далей. Была ўжо глыбокая ноч. Дзіцё крычэла без перастанку. Змучаная я пастукала ў першыя дзьверы і папрасіла малака, або вады, каб напаіць дзіця. Мяне аблаялі і пагражалі паклікаць паліцыю. Нібы ў васьне я пайшла далей. Дзіця ад крыку аж корчылася. У галаве шум, крык дзіцяці б'е малатком у галаву. Я зьненавідзела сябе, сваё дзіця і цэлы сьвет. Хацелася аднаго—спаць. Спаць і каб скончыўся крык дзіцяці. Тут я спаткнулася за корч упала і ўпусьціла з рук дзіця. Падняла і паклала яго на калені. Зараз-бы заснуць. Але гэты крык, ад яго звар'яцець можна. Потым узяла дзіця і прыціснула нічком да зямлі.—мацней, мацней, каб ня крычэла. Захліпнулася раз—і змоўкла. Я лягла побач і заснула.

Вось і ўсё. Ці каюся я? Калі была я ў турме—гэта быў адзіны мой адпачынак за ўсё маё жыцьцё—я вельмі многа перадумала; дайшла да таго, што зрабіла падурному. Ня трэба было ўбіваць так сябе і забіваць дзіця—мне трэба было пайсьці да багацеяў, такіх самых гаротных жанчын як і я, і калі-б мы пайшлі з дзецьмі на руках да вашых палацаў, я ведаю, вы-б не пашкадавалі для нас куль. Ну, страляйце, страляйце ў дзяцей, страляйце ў галодных жанчын. Але гэта была-б такая сьмерць, якая каго-небудзь усхвалявала-б, можа надала-б сілы беспрацоўным не чакаць, пакуль прыдзе ціхая сьмерць з голаду, а з кулакамі кінуцца і перагрызці горла ўсім тым, што ня толькі даюць мільёнам галадаць, але і гэтым голадам карыстаюцца і на ім будуюць сваё багацьце. Лепш было-б прыйсьці сюды ў суд і плюнуць у твар усім судзьдзям, засядацелям, усім тым паном, што моляць нас голадам, а потым яшчэ і судзяць.

У залі гоман, Старшыня загадвае вывесьці падсудную. Вартавы цягне яе да дзьвярэй.

— Усе вы зладзеі і разбойнікі! Адна банда ката ,—гістэрычна крычыць падсудная.

Падсудную выкідаюць за дзьверы. Яна плача. Абаронца гаворыць, што падсудная ня пры памяці. Але суд на гэта ня ўважае. За забойства дзіцяці суд засудзіў Ганну Коўтс—павесіць.

„СТ".

# Умовы працы на капіталістычных рацыяналізаваных прадпрыемствах

Вялізарная інтэнсыфікацыя працы на рацыяналізаваных прадпрыемствах праводзіцца адначасова з павялічэньнем рабочага дня.

Як агульнае правіла, можна адзначыць, што ў тых галінах прамысловасьці, у якіх жаночая праца пераважае, рабочы дзень найбольш працяглы.

У Нямеччыне, у тэкстыльнай прамысловасьці, у якой з агульнай колькасьці 1.200 тысяч рабочых, жанчыны складаюць 700 тысяч, сярэдняя працяжнасьць рабочага тыдню 51—54 гадзіны, прычым часта яна даходзіць і да 60 гадзін у тыдзень. У Злучаных Штатах Амэрыкі, у штаце Паўночнай Караліны, працяжнасьць рабочага дня тэкстыльшчыцы—11 гадзін.

У Ангельшчыне існуе спэцыяльны закон для тэкстыльшчыц аб 12-гадзіным рабочым дні з 2-гадзінным перапынкам на абед і такі-ж 12-гадзінны рабочы дзень, толькі з 1½ гадзінным перапынкам, для іншых галін прамысловасьці.

Закон дапускае нявызначаную і начную работу для жанчын.

У Аўстрыі існуе закон аб 44-гадзінным рабочым тыдні для работніц. На практыцы закон гэты з маўклівай згоды сацыял-фашыстаў ніколі ў жыцьцё не праводзіцца.

У краінах фашызму, як Італія, Румынія, Польшча. рабочы дзень работніцы працягваецца 10—12 гадзін.

У Кітаі рабочы дзень работніцы на ангельскіх прадпрыемствах у 1928 годзе быў 11 гадзін, а ў 1930 годзе—12 гадзін. На японскіх прадпрыемствах у 1928 годзе—12 гадзін, у 1929 годзе—13 гадзін, а ў 1930 годзе—13—14 гадзін.

На прадпрыемствах кітайскіх капіталістаў, рабочы дзень работніцы ў 1927 годзе быў 12 гадзін, а ў 1928 годзе—13 гадзін, у 1929 г.—13—14 гадзін, а ў 1930 годзе нават 14—16 гадзін.

У Японіі працяжнасьць дня работніцы 11—13 гадзін, ня гледзячы на існуючы закон аб увядзеньні 10-гадзіннага рабочага дня з чэрвеня 1929 году.

Пад гром гармат сям'я кітайца уцякае з Чапэю (Кітай).

У Індыі нават на падземных работах працяжнасьць рабочага дня работніцы—11—13 гадзін.

Ня гледзячы на вялізарны рост беспрацоўных і працуючых ня поўны рабочы тыдзень, капіталісты шырока ўжываюць звышнармовую работу, да якой прыцягваюцца і работніцы. У аднэй толькі Чэха-Славакіі ў 1929 годзе было выдана 5.507 дазволаў на 16 мільёнаў звышнармовых гадзін, у Бельгіі—на 4 мільёны звышнармовых гадзін.

Апрача таго, капіталісты ўжываюць усякага роду хітрыкі, каб за звышнармовую работу плаціць у аднаразовым разьмеры.

Напружаная, інтэнсыўная работа пры доўгім рабочым дні, пры галоднай зарплаце прыводзіць да заўчаснага зьнясільля работніц, да масавых захворваньняў, у першую галаву нэрвовай сыстэмай.

У Нямеччыне на мэталюргічных прадпрыемствах Сымэнса кожная шостая работніца хворая на нэрвовую хваробу. Сярод работніц Нямеччыны за апошнія два гады колькасьць сухотных захворваньняў павысілася на 88,3 проц. Нават буржуазныя вучоныя прымушаны прызнаць глыбока разбураючае дзеяньне высокай інтэнсыўнасьці працы пры адсутнасьці ўсялякай аховы яе на жаночы арганізм. Так, загадчык дзяржаўнага бюро Аховы Здароўя ў Гамбургу, прызнаў, што колькасьць мёртванароджаных дзяцей у прамысловых работніц у сярэднім у пяць разоў вышэй, чым у жанчын астатняга насельніцтва.

У Лодзі карэта хуткай дапамогі выклікаецца па 100—125 разоў у дзень да работніц, якія падаюць ад зьнясільля і напруджаных тэмпаў работы.

Адсутнасьць мер перасьцярогі пры гэтых шалёных тэмпах работы выклікае ва ўсіх капіталістычных краінах вялізарны рост няшчасных выпадкаў. У Нямеччыне з 1924 па 1929 год было 6 мільёнаў зарэгістраваных няшчасных выпадкаў на прадпрыемствах.

Паводле абсьледваньня прамысловага інспэктара, у Саксонскім тэкстыльным раёне на 100 рабочых у 1926 годзе прыходзілася 44 няшчасных выпадкаў, у 1927 годзе—57, у 1928 годзе ўжо 62 выпадкі.

На аўтамабільным заводзе Сітроена (Францыя) за адзін 1929 год колькасьць няшчасных выпадкаў выросла з 7.000 да 8.000.

У Злучаных Штатах Амэрыкі, у Штаце Місуры, на кансэрвовай фабрыцы, у 1930 годзе з-за адсутнасьці неабходных мер перасьцярогі, здарыўся выбух аманічнага газу. Узарвалася 18 цыстэрн. У выніку катастрофы аказалася 20 забітых і больш тысячы параненых. 18 маладых дзяўчат былі зажыва пахаванымі ў сутарэньні.

У Аўстрыі, згодна афіцыяльных даных, колькасьць няшчасных выпадкаў з работніцамі ў 1929 годзе, у параўнаньні з 1928 годам павялічылася на 37 проц.

**З. Баярская.**

# Калдагавор узьняў актыўнасьць рабочых і работніц ў барацьбе за прамфінплян

Калдагаворная кампанія бягучага году павінна была быць скончана 15-га сакавіка. Па большасьці асноўных прадпрыемстваў калдагавары былі заключаны ў вызначаны тэрмін, але ёсьць прадпрыемствы, дзе з заключэньнем калдагавору спазьніліся (па запалкавай прамысловасьці, дрэваапрацоўчай і некаторых іншых, а таксама па саўгасах, МТС і па частцы ўстаноў). VII усебеларускі зьезд прафсаюзаў мабілізаваў звыш 30 дэлегатаў зьезду для дапамогі месцам у перазаключэньні калдагавароў і выпраўленьня памылак, зробленых пры правядзеньні калдагаворнай кампаніі, якая набывае ў бягучым годзе выключнае значэньне. 1932 год павінен завяршыць пяцігодку за 4 гады і забясьпечыць пасьпяховы ўступ у другую бальшавіцкую пяцігодку—пяцігодку пабудовы бяеклясавага сацыялістычнага грамадзтва. Першы этап калдагаворнай кампаніі—праверка старога дагавору і падрыхтоўка да перазаключэньня новага—паказаў, што некаторыя заводзкія арганізацыі недаацанілі гэтай важнейшай гаспадарча-палітычнай кампаніі ў справе забесьпячэньня выкананьня задач 1932 году. У выніку палова першага кварталу не дала належнага пералому ў выкананьні прамфінпляну, і прамысловасьць за студзень і частку лютага вышла з прарывамі.

Поўных вестак аб выніках другога этапу калдагаворнай кампаніі яшчэ няма, але папярэднія даныя сьведчаць аб тым, што другі этап праходзіць пры больш рашучым і канкрэтным ажыцьцяўленьні 6-ці ўмоў тав. Сталіна, што мае адбітак на выкананьні прамфінпляну за другую палову лютага і першую палову сакавіка. Гомсельмаш выканаў плян за люты на 137 проц. Першая дэкада сакавіка дала выкананьне месячнага заданьня 42 проц., зьніжэньне браку—з 9,5 проц. да 8,74 проц. За час другога этапу калдагаворнай кампаніі паступіла дадаткова 60 рабочых прапаноў, зьменшылася колькасьць прастояў, швэйная фабрыка „Камінтэрн“, дзе пераважная частка (60 проц.) працуючых жанчын, выканала плян у лютым на 100,7 проц. замест 71 проц. у студзені і здавальняюча выканала плян за першую палову сакавіка. Колькасьць пераробак зьнізілася з 11,8 проц. за студзень да 8,7 проц. за люты, павялічылася колькасьць гаспадарча-разрахунковых брыгад з 30 да 54, прычым некаторыя амаль выключна з работніц. Усе брыгады перавыконваюць плянавыя заданьні цэхавыя і сустрэчныя. 29 рабочых падалі заявы ў партыю, з іх 8 работніц, 15—у камсамол. Калдагаворам прадугледжана ахапіць зьдзельшчынай 98 проц. Прадугледжаны канкрэтныя мерапрыемствы па паляпшэньні сацыяльна-бытавых умоў.

Такія-ж здавальняючыя вынікі ёсьць і на некаторых гутах (імя Домбаля і інш.) і на радзе іншых прадпрыемстваў. Але на некаторых прадпрыемствах ёсьць шмат памылак і скажэньняў, як нявыразная прапрацоўка і канкрэтызацыя паказальнікаў прамфінпляну, асабліва па росьце прадукцыйнасьці працы і зьніжэньні сабекошту на кожным вытворчым вучастку, недастатковая масавасьць. Асобныя дагавары, якія ўжо паступаюць у органы НКПрацы для рэгістрацыі, складзены нявыразна, пункты, узаемныя абавязкі сфармуляваны „агульна“, або скапіяваны з тыповага дагавору, не канкрэтызаваны ва ўмовах свайго прадпрыемства і вучастку працы.

Зразумела, што такі дагавор нікому не патрэбен па прычыне таго, што ён мала дае ў справе забесьпячэньня выкананьня ўзаемных абавязкаў, і нельга ўстанавіць пастаяннага кантролю над іх выкананьнем, бо самыя абавязкі не канкрэтны, складзены „агульна“.

Калі дагавор заключан без мабілізацыі мас вакол асноўных паказальнікаў вытворчасьці і паляпшэньня культурна-бытавога абслугоўваньня, неабходна на-хаду выпраўляць такія памылкі, зьнішчаць скажэньні; ня трэба спыняцца і перад паўторным абгаварэньнем асноўных момантаў дагавору сярод рабочай масы.

З боку паасобных гаспадарнікаў наглядаецца нежаданьне прымаць удзел у перазаключэньні калдагавору, лічачы гэта справай выключна прафсаюзных арганізацый. Гэта мела месца ў некаторых галінах прамысловасьці НКС, Белкаапсаюзу, НКЗему і інш.

Некаторыя гаспадарнікі зусім нясур'ёзна падыходзяць да вызначэньня паказальнікаў пляну, даюць іх яўна перапаменшанымі, у выніку дрэннай падрыхтаванасьці і ў мэтах самастрахоўкі (Белсельаб'яднаньне, садагародтрэст, лугавая гаспадарка і інш.). Неабходна ўдарыць па такіх гаспадарніках.

Нельга абмежавацца перазаключэньнем калдагавору, як кампаніяй. Калдагавары павінны заставацца апэрацыйным дакумантам на ўвесь час яго дзеяньня, усе абавязкі па ім павінны быць выразна даведзены да кожнага рабочага месца. Неабходна стварыць штодзенны кантроль над выкананьнем узаемных абавязкаў, над захаваньнем правільных суадносін паміж ростам прадукцыйнасьці працы і зарплатай, не дапускаючы ў далейшым такіх ганебных зьявіш, як перавыдаткаваньне вялізарных сродкаў па фондзе зарплаты.

Нельга дапускаць у далейшым такіх выпадкаў, калі дагавор пасьля яго заключэньня здаецца ў архіў і ніхто ў яго не заглядвае. І пасьля спрачаюцца па тых пытаньнях, якія ў калдагаворы ўжо былі вырашаны. Гэта мела месца на добрускай фабрыцы. На голковай фабрыцы, на некаторых цагельных заводах мелася ўсяго па 1—2 экзепляраў дагавароў.

Цэнтральная задача калдагавору 1932 году—гэта забясьпечыць рэалізацыю пастаноў XVII Усесзюзнай партканфэрэнцыі: „На аснове эканоміі, лепшага скарыстаньня вытворчых магчымасьцяй, лепшай мабілізацыі сіл і лепшага практычнага кіраўніцтва, даць краіне больш прадукцыі і лепшай якасьці“.

Стрыжнявыя пытаньні калдагавору—гэта павышэньне прадукцыйнасьці працы, якасьці прадукцыі, зьніжэньне сабекошту, паляпшэньне матар'яльных і культбытавых умоў рабочай клясы. Гэта зусім рэальна і магчыма выканаць на аснове рашучага ажыцьцяўленьня 6-ці ўмоў тав. Сталіна.

І. А.

ГПБ Ср.-Ав.

# КАЛДАГАВОР У ДАПАМОГУ ПРАМФІНПЛЯНУ

14-га сакавіка на канфэрэнцыі ўсіх рабочых друкарні імя Сталіна быў дэтальна абгаворан і падпісан калдагавор.

Гэты калдагавор загадзя абгаворваўся ў цэхах, брыгадах, уносіліся прапановы, зьмены і дадаткі. Такім чынам, у прапрацоўку калдагавору былі ўцягнуты ўсе рабочыя.

Тав. Скаблова брыгадзір гаспадарча-разрахунковай брыгады імя XVII партканфэрэнцыі (ф-ка Клары Цэткін г. Віцебск).

Падпісаны калдагавор прадугледжвае выпуск валавой прадукцыі на 2.648.371 руб., пры павялічэньні прадукцыйнасьці працы на 9,4 проц. на базе рацыяналізацыі, вынаходзтва і інш., зьніжэньне сабекошту на 4,2 проц.

Рост зарплаты прадугледжан у параўнаньні з сярэдняй гадовай зарплатай 1931 году на 3,3 проц. Калдагавор усямерна спрыяе разьвіццю творчай, рацыяналізатарскай ініцыятывы, адпускаючы на гэту справу 2.000 руб.

На аздараўленьне ўмоў працы адпускаецца 5000 руб. Новы калдагавор прадугледжвае абавязковы рамонт душу для рабочых, наяўнасьць гатаванай вады, мыла, выдачу спэцвопраткі.

Па капітальным будаўніцтве ўкладваецца на набыцьцё новых машын 34.000, на набыцьцё шрыфту 40.000.

Калдагавор прадугледжвае ў мэтах укараненьня жаночай рабочай сілы ў вытворчасьць пры наборы рабочых прыняць ня менш 30 проц. жанчын.

У мэтах паляпшэньня рабочага забесьпячэньня адміністрацыя абавязалася пабудаваць адкормачны нункт, адрамантаваць сталоўку, на гэтыя мэты адпускаецца 4.000 р. Адміністрацыя абавязваецца рабочым цынкаграфіі і стэрэатыпнаму цэху выдаваць спэцхарчаваньне.

Дагавор прадугледжвае пасылку 13 чалавек ударнікаў на курорты і ў дамы адпачынку.

Для культабслугоўваньня рабочых друкарні адміністрацыя адпускае на ўтрыманьне клюбу пры друкарні 6500 руб. Для арганізацыі і ўтрыманьня ясьляй адпускаецца 2.800 руб.

У мэтах разьвіцьця і ўмацаваньня тэхпрапаганды вызначана 300 руб. на ўтрыманьне масава-тэхнічнай бібліятэкі і на дадатковыя выдаткі па арганізацыі масавай тэхпрапаганды, і 500 руб. на вытворчыя экскурсіі рабочых і аплату вучобы 25 рабочых на завочных тэхкурсах.

Рабочыя і ІТР, з аднаго боку, і адміністрацыя—з другога ўзялі на сябе ўзаемныя абавязкі па выкананьні прамфінпляну. Яны абавязваюцца ўсе заданьні выконваць шляхам цьвёрдага правядзеньня ў жыцьцё 6 умоў тав. Сталіна, адзінаначальля, умацаваньне працоўнай дысцыпліны, разгортваньнем сацспаборніцтва і ўдарніцтва, суровага рэжыму эканоміі, разьвіцьця рабочага вынаходзтва.

К.

## Абгаварэньне калдагавору выклікала новы ўздым творчага энтузіазму

(*„Чырвоны тэкстыльшчык“ гор. Менск*)

Калдагавор на фабрыцы прапрацаваны па ўсіх брыгадах і групах і на 6-ці сходах рабочых, на якіх была 100-проц. яўка работніц і рабочых. У часе калдагаворнай кампаніі разгорнута шырокая работа па ўцягненьні новых мас работніц ва ўдарныя і гаспадарча-разрахунковыя брыгады. Арганізаваны 3 гаспадарча-разрахунковыя брыгады. Прынята ў партыю 9 работніц. Праведзена масавая праверка сацдагавароў, з 300 рабочых—220 ўдарнікаў, з якіх прэміяваны 10 лепшых ударніц.

Наладжана праца лікпункту і школы малапісьменных, апошнімі ахоплены ўсе няпісьменныя работніцы. Шырока разгорнута работа па калектыўным страхаваньні жыцьця рабочых. Разгарнулі шэфскую работу. У падшэфны Пухавіцкі раён паслана брыгада з 5 асоб для ўдзелу ў веснавой пасеўнай кампаніі. Закуплена бібліятэка для падшэфнага раёну на 35 руб.

Ёсьць дасягненьні і ў ваеннай вучобе. За добрую стралянінў прэміяваны лепшыя ўдарніцы Соіна і Швэйдэль. Аформлена і ўмацоўваецца шэфства над вайсковым шпіталем. Ёсьць значныя зрухі ў выкананьні прамфінпляну. Прадукцыйнасьць працы па панчошным цэху павысілася на 6,3 пр., па матальным цэху—на 6,5 проц. Па ўсёй фабрыцы прамфінплян за першую дэкаду сакавіка выканан на 5,7 проц. больш у параўнаньні з лютым.

Праект новага калдагавору прадугледжвае: абсталяваньне кухні-сталовай на фабрыцы не пазьней чым да 3-га кварталу. Абсталяваньне мэдпункту. Пабудову двух вэнтылятараў у панчошным цэху, аднаго ў швэйна-пецельным, выцяжной вэнтыляцыі ў фарбарні.

1/4 проц., зарплаты адпускаецца на ўтрыманьне ясьляй пры фабрыцы, 200 руб. на арганізацыю піянэр-лягеру. Фабрыка „Чырвоны тэкстыльшчык“ падрыхтавана да падпісаньня новага калдагавору.

К.

# Работніцы, калгасьніцы і працоўныя жанчыны, прымеце актыўны ўдзел у працы па мабілізацыі сродкаў

Пасьпяховае выкананьне фінплянаў мае вялізарнае значэньне для апошняга году пяцігодкі. Допісы рабселькорак з месц гавораць аб пасьпяховай працы ў галіне мабілізацыі сродкаў паасобных прадпрыемстваў, калгасаў і дэлегацкіх сходаў.

Панчошная ф-ка перавыканала кантрольнае заданьне па распаўсюджаньні пазыкі „Трэці рашаючы". Дэлегаткі м. Лёзна дапамаглі ў ліквідацыі прарыву ў галіне мабілізацыі сродкаў. Работніцы саўгасу „Беліца" сабралі ў фонд абароны краіны 180 р., ёсьць шмат іншых прыкладаў сапраўднага, бальшавіцкага змаганьня на фронце мабілізацыі сродкаў.

Работніцы, калгасьніцы і працоўныя жанчыны, мы ўступілі ў другі квартал апошняга году пяцігодкі. Рашуча, па-бальшавіцку змагайцеся за выкананьне фінплянаў другога кварталу. У сябе на прадпрыемствах, у саўгасах, калгасах праводзьце дадатковую падпіску на пазыку „Трэці рашаючы". Працягвайце збор у фонд абароны краіны. Арганізуйце ўдарныя брыгады для дапамогі сельсаветам і гарсаветам у справе мабілізацыі сродкаў. Вярбуйце новых укладчыкаў у ашчадкасы.

## Распаўсюджваем пазыку

Панчошная фабрыка імя 8 сакавіка выканала заданьне па падпісцы на пазыку на 2.900 руб., а вызначана было 2.500 р. Гэтыя посьпехі дасягнуты дзякуючы апэрацыйнасьці фабрычных арганізацый, актыўнай працы старшыні фабкому тав. Саколінай, якая на працягу 2-х дзён ахапіла падпіскай рабочых. Некаторыя рабочыя падпісаліся звыш месячнага акладу. Чаўская зарабляе 60 руб.—падпісалася на 80. Мышакоў зарабляе 79 — падпісаўся на 110 рублёў.

Але ёсьць і такія, якім ніякай справы няма да пазыкі. Гэта Луганава, Каплан, Кушікава, Віленская, Маліцкая, Эськіна, Сінокевіч. Трэба адзначыць, што першыя тры з іх зьяўляюцца членамі камсамолу.

Кудраўская Чэрня.

Гомель.

## Дэлегаткі дапамаглі

Дэлегаткі пры Лёзьнянскім местачковым савеце актыўна дапамагаюць правядзеньню гаспадарча-палітыч ых кампаній.

Калі ў рабоце местачковага савету быў прарыў у мабілізацыі сродкаў у гэтым квартале, дэлегаткі, абгаварыўшы гэта пытаньне, арганізавалі ўдарную брыгаду імя 8-га сакавіка на дапамогу савету. Праробена вялікая праца. У выніку да 8-га сакавіка прарыў у мабілізацыі сродкаў ліквідаван, і плян перавыканан на 112 проц.

Ударніцы-дэлегаткі па мабілізацыі сродкаў Апанасенка, Весялуха, Пяршова, Ханіна, Казлова, Троек і Хайкіна ў дзень 8-га сакавіка прэміяваны, дзьве прамтаварамі і іншыя грашыма па 25—40 руб.

В. М.

Тав. Трыбуц ударніца ф-кі „Ўсход" (Менск). Прэміявана за ўдарную работу па мабілізацыі сродкаў.

## Члены Асоавіяхіму актывісткі па мабілізацыі сродкаў

— Да дня 8 га сакавіка ў ячэйцы Асоавіяхіму чыгуначнікаў налічвалася 19 асоб, зараз значна выросла ячэйка. Яна практычна дапамагае аздараўленьню транспарту, жанчыны—члены Асоавіяхіму закупілі пазыкі на 150 р. Узялі на сябе абавязак па правядзеньні растлумачальнай работы сярод мужоў па канчатковай ліквідацыі абязьлічкі і прагулаў на транспарце.

На станцыі Жлобін, Заходняй чыгункі, дэлегаткі сабралі на дырыжабль імя Леніна 176 руб. 70 кап. Рэалізавалі білетаў Асоавіяхіму на 200 руб., абавязаліся завербаваць 50 жанчын членаў Асоавіяхіму.

Работніцы Лесбелу да 8-га сакавіка былі ахоплены сацспаборніцтвам і ўдарніцтвам на 50 проц., а зараз ахоплены на 100 проц. Усяго налічваецца 40 работніц. Прамфінплян ў 1931 годзе выканан на 107 пр. Да 8-га сакавіка 3 работніцы-ўдарніцы прыняты ў рады партыі, адну работніцу вылучылі загадчыкам паравога млыну.

Паўлючэнка.

## Распаўсюдзілі дадаткова пазыкі на 800 рублёў

Дэлегацкі сход мястэчка Прапойску, абгаварыўшы пытаньне мабілізацыі сродкаў, парашыў практычна дапамагчы ў гэтай справе, для чаго вылучыў дзьве брыгады.

Брыгады паміж сабою заключылі сацдагаворы на лепшае распаўсюджаньне пазыкі „3-ці рашаючы".

У выніку працы брыгад распаўсюджана дадаткова пазыкі на 800 руб.

Дэлегацкі сход выклікаў на сацспаборніцтва па мабілізацыі сродкаў дэлегацкія сходы Асінавіцкага, Чавускага і Чэрыкаўскага раёнаў.

Калечкава П.

## Да 8-га сакавіка ліквідуем свой доўг

Ячэйка МОПР'у шоўкавай істужкі (фабрыка „Кастрычнік", гор. Менск),. пастанавіла сабе задачай ліквідаваць сваю запазычанасьць па членскіх узносах у МОПР. Усе работніцы, як адна, заявілі, што мы заўсёды гатовы дапамагчы нашым сёстрам і братом па клясе.

Работніца Мільнэр.

# Больш увагі масавай працы сярод работніц, прыстасуем яе да розных груп работніц

## Масавая праца на ільнозаводзе імя Сталіна

*(Шклоўскі раён)*

Шклоўскі раён зьяўляецца ільнаводчым раёнам. У гэтым годзе па раёне засяваецца ільну 14 тысяч *га*.

Вялікую ролю ў справе апрацоўцы сырцу адыгрываюць ільназаводы.

Шклоўскі ільназавод імя Сталіна—новы завод, які працуе ўсяго толькі з верасьня месяца 1931 году. На заводзе працуе каля 200 чалавек, з іх 150 жанчын, з якіх 50 чалавек зусім нядаўна прышлі на завод і яшчэ нават не зьяўляюцца членамі прафсаюзу.

Перад партыйнай, праф. і іншымі арганізацыямі ільназаводу стаіць адказьнейшая задача па перавыхаваньні новых работніц, якія прышлі з вёскі. Уцягнуць іх непасрэдна ў сацыялістычнае будаўніцтва, ахапіць сацспаборніцтвам і ўдарніцтвам, палітычнай і тэхнічнай вучобай.

На заводзе арганізован і працуе з 25-1 дэлегацкі сход, якім ахоплена 30 чалавек, праца прыстасавана да зьмен. Працуюць 4 групы.

Значную ўвагу парт'ячэйка зьвярнула на выхаваньне работніц і лепшых ударніц, апраўдаўшых сябе на вытворчай працы, і перадачу іх у партыю. За час існаваньня заводу ўжо прыняты ў партыю чатыры жанчыны і падрыхтавана 8 жанчын.

На заводзе разгортваецца праца па ахопе жанчын гурткамі па вывучэньні тэхнікі, у якіх ужо навучаецца 55 жанчын. Перадавыя ўдарніцы прымаюць удзел у рацыяналізацыі вытворчасьці, уносячы каштоўныя рацыяналізатарскія прапановы, у выніку прыстасаваньня якіх завод будзе мець досыць значныя зьберажэньні. Так, у прапанове работніцы Кузьміновай на турбіне прыстасавалі нажы і зараз наматкі, якія ствараліся і перашкаджалі у рабоце, ліквідаваны на 80 проц.

Па прапанове работніцы Ліпкінай—скарочаны два чалавекі—укладчыкаў утамбары, шляхам прымацаваньня іх да возчыкаў і пераводу іх на зьдзельшчыну. Усе работы на заводзе праведзены на зьдзельшчыну, уведзена і прэміяльна прагрэсыўная зьдзельшчына, ударніцтвам і сацспаборніцтвам ахоплены 123 чалавекі.

Малапісьменных і няпісьменных, на заводзе каля 70 чалавек, ахоплена вучобай 50 чалавек, разгортваецца праца, каб прыцягнуць да вучобы ўсе 100 проц.

Шырока разгорнута на заводзе прапрацоўка пастаноў XIV-га зьезду КП(б)Б і XVII канфэрэнцыі УсеКП(б). Прапрацоўваецца на агульных сходах рабочых, па зьменах, на дэлегацкіх сходах, у гурткох. Арганізавана ўдарная камсамольская брыгада імя 8-га сакавіка.

У часе сьвяткаваньня 8-га сакавіка, партарганізацыя ільназаводу мабілізавала масы рабочых на выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну па прыкладзе ўдарных брыгад Пачакаевай, Абрамавай і іншых. Трэба наладзіць палітвучобу, культмасавую працу, праддысцыпліну, усіх ахапіць вучобай.

**В. Жураўлёва.**

## Аўладалі тэхнікай сваёй вытворчасьці

*(Віцебская панчошная ф-ка імя Клары Цэткін)*

Гурток па аўладаньні тэхнікай вязальных аўтаматаў існуе ў нас нядаўна. Але, рэгулярна наведваючы заняткі, мы за гэты час атрымалі многа ведаў. Калі раней мы ня ведалі, як абыходзіцца з машынай і за ўсялякай дробязьзю зварачаліся да мэханіка, то зараз мы ўжо ведаем, як паменшыць колькасьць штопкі, калі і як трэба пераводзіць ланцуг і барабан, як працуе нітканавадзіцель, можам устанаўляць плацiны, ведаем, калі трэба рабіць вязку больш густой. Дзякуючы гэтым ведам, мы дабіліся эканоміі, іголак, зьменшылі процант браку і штопкі. Усе работніцы павінны наведваць гурток па вывучэньні тэхнікі сваёй машыны.

**Работніцы Азарх і Гуткіна.**



Сернакіслотны завод Васкрсэнскага хэмкамбінату.

# Падымем кваліфікацыю работніц

У часе рэйду па праверцы масавай работы сярод работніц на скурна-галянтарэйнай фабрыцы „Усход" (гор. Менск) брыгада высьветліла наступнае: На фабрыцы налічваецца 549 жанчын, але з імі ніякай асобнай працы не праводзілася. Абмежаваліся тым, што ў першай палове 1931 году выбралі дэлегатак і вылучылі жаноргa. Парткалектыў ніколі не заслухоўваў фабрычнага жаноргa тав. Каган і ніякіх канкрэтных указаньняў у працы ёй не даваў.

**13 жанчын работніц вылучаны на адказную адміністрацыйную работу:** 4 у ТНБ, 5 інструкгарамі і 4 бракерамі, адна работніца выбрана сакратаром фабкому. Аднак, **ні партыйныя ні прафсаюзныя арганізацыі не аддалі належнай увагі дапамозе вылучэнкам,** у выніку некаторыя вылучэнкі, як тав. Гэйзер з цэху грамадзянскага рыштунку зьвярнуліся зноў да варштатаў.

Дрэнна пастаўлена праца ў справе павышэньня кваліфікацыі работніц. З 25 проц. работніц, што працуюць у закройным цэху, амаль усе працуюць на ніжэйшых разрадах (4—6), на 7 разрадзе працуюць толькі 2 работніцы, а на 8—ніводнай.

Лепшыя работніцы-ўдарніцы, як тав. Ляўкові і іншыя, у часе прэміяваньня прэміі не атрымалі. Слабы ўдзел прымаюць работніцы ў працы вытворчых нарад, **надзвычай мала паступае ад работніц рацыяналізатарскіх прапаноў.** За апошні квартал 1931 г. паступілі ўсяго 2 прапановы, а за 2 месяцы 1932 году—5 прапаноў.

Вылучэнкі ф-кі „Усход" тав. Плакс—інструктар, тав. Анэфрэюк — майстар, т. Кельнер—бракер.

**17 работніц - няпісьменных і 31 малапісьменных ахоплены ліквпунктамі, 6 работніц навучаюцца індывідуальна. Але ўмовы для наведваньня ліквпункту работніцам ня створаны. Зусім адсутнічае памяшканьне для заняткаў, няма ні ясьляй, ні дзіцячага саду для дзяцей работніц. Жактаўскі дзіцячы сад і ясьлі, дзе прымаюцца дзеці работніц фабрыкі, працуюць толькі на аднэй зьмене.** Вынікам гэтага зьяўляецца часткова цякучасьць і частыя прагулы работніц.

**Арганізаваны гурткі па вывучэньні тэхнікі,** у якія запісалася каля 30 проц. работніц, але з-за адсутнасьці кіраўніцтва гурткі працуюць слаба.

У рэйдзе прымалі ўдзел 24 работніцы, якія апрача праверкі масавай працы сярод работніц зрабілі наступнае: падрыхтавалі да пераходу на гаспадарчы разрахунак брыгады імя 8-га сакавіка партфэльна-кашалёчнага цэху ў колькасьці 10 асоб, дзьве брыгады грамадзянскага рыштунку ў колькасьці 10 чалавек. Апрача гэтага ў цэху грамадзянскага рыштунку 3 няпісьменныя работніцы абавязаліся ва ўдарным парадку ліквідаваць сваю няпісьменнасьць да 1-га мая 1932 году.

**У цэху грамадзянскага рыштунку і партфэльна-кашалёным арганізаваны дзьве брыгады друку, якія ўзялі на сябе абавязак правесьці падпіску на часопісь „Работніца і калгасьніца Беларусі", уключыцца ў конкурс, ажывіць цэхавую штодзенку і быць актыўнымі рабкорамі штодзенкі і часопісі „Работніца і калгасьніца Беларусі".**

Брыгада: Гершон, Ждановіч, Маліноўская, Сяргейчык, Міркіна, Зільбэрглейд, Хоміч, Наўмовіч, Казлоўская, Палазьнік, Гарэлава, Шабанава, Рудзіцэр, Маскалевіч, Чэрчэс, Пэрэльман, Эпштэйн, Фукт, Прэсман, Сасноўская, Калодкіна, Фішкіна, Вігдорчык.

## ДА 1-га МАЯ 1932 г. ПЕРАТВОРЫМ БССР У КРАІНУ СУЦЭЛЬНАЙ ПІСЬМЕННАСЬЦІ

### Прошчыцкі сельсавет адстае

*(Слуцкі раён)*

Сельсавет зусім амаль не займаецца справай ліквідацыі няпісьменнасьці. **30 проц. няпісьменных да гэтага часу не ахоплены ліквпунктамі. У большасьці сваёй—гэта жанчыны.**

**У калгасе „Авангард" па віне настаўніка праца ліквпункта вельмі часта зрываецца.**

Нармальна працуе ліквпункт толькі ў калгасе „Чырвоная Васея", дзе навучаецца 40 чалавек няпісьменных.

**Застаўшыйся месяц да 1-га мая трэба скарыстаць для ліквідацыі гэтага прарыву.**

**А. Ш.**

### Ліквпункт не працуе

У Бяседавіцкім сельсавеце, Касьцюковіцкага раёну, ёсьць шмат няпісьменных, якія жадаюць вучыцца, але тры ліквпункты, якія ёсьць на тэрыторыі сельсавету, зусім не працуюць.

У калгасах „Іскра", „Пераможца", „Чырвоны ўсход" ёсьць 79 жанчын, падлягаючых навучаньню, але навучаюцца толькі 17. З прычыны зрываў заняткаў на ліквпунктах, жанчыны адмаўляюцца хадзіць на заняткі.

Сельсавету і раённай інспэктуры асьветы патрэбна наладзіць працу ліквпунктаў.

**Лупікаў Ф.**

### Кулічкаў зрывае працу дэлегацкага сходу

Пры калгасе імя Сьвярдлова (Рагачоўскі раён, Сьвяцкі сельсавет) арганізован дэлегацкі сход з 25 чалавек, але ён цэлы год не працаваў з прычыны нядбайных адносін кіраўніка Кулічкова.

Дэлегаткі хочуць працаваць. Ячэйка павінна зьмяніць кіраўніка сходу.

**Бэрта.**

ГНБ Сл.-Ав.

# ХАТНІЯ ГАСПАДЫНІ—АКТЫЎНЫЯ ГРАМАДЧЫЦЫ

7-га сакавіка адбыўся агульны сход жанчын-хатніх гаспадынь пры Магілеўскім гаржылсаюзе.

На сходзе быў урачысты выпуск гуртка першай дапамогі, які складаўся з дэлегатак і хатніх гаспадынь. Слухачы гуртка паказалі добрыя посьпехі, за што іх прэміяваў райсавет Чырвонага крыжу. За добрую грамадзкую работу гаржылсаюз прэміяваў 2? дэлегаткі. На сходзе былі складзены брыгады імя 8-га сакавіка для дапамогі падшэфнаму калгасу ў правядзеньні веснавой пасеўкампаніі. Хатнія гаспадыні, не забылі таксама сваіх інтэрнацыянальных абавязкаў. У адказ на прысуд амэрыканскага крывавага суда аб кары 8 маладых рабочых-нэграў, сабралі ў карысьць МОПР'у 35 р. 60 кап. Сабралі падпіску на часопісь „Работніца і калгасьніца Беларусі" на 300 руб. І надалей абязуемся пакласьці ўсю энэргію на справу сацыялістычнага будаўніцтва.

Дэлегатка Малочнікава.

Магілеў.

* * *

Па Менскім гаржылсаюзе агульнымі сходамі, прысьвечанымі 8-му сакавіку, было ахоплена больш чым 9.000 хатніх гаспадынь. Праведзена 17 вечароў, прысьвечаных 8-му сакавіка.

12-ты жакт правёў суботнік у карысьць МОПР'у. Адбыўся зьлёт дэлегатак 9-ці пунктаў, які абвясьціў сябе ўдарным па мабілізацыі сродкаў. Праведзена канфэрэнцыя няпісьменных 20-га жакту, якія абавязаліся ўдарнымі тэмпамі да 1-га мая 1932 году ліквідаваць сваю няпісьменнасьць. Дэлегацкі пункт 12-га жакту абвясьціў сябе мабілізаваным для ўдзелу ў веснавой пасеўнай кампаніі. За добрую грамадзкую працу прэміяваны 50 хатніх гаспадынь. Па 14 раёну сабралі падпіскі на часопісь „Работніца і калгасьніца Беларусі на 114 руб.

Па баявому разгорнута праца добраахвотных грамадзкіх арганізацый, за што гарсаветам Асоавіяхіму былі прэміяваны 5 ячэек АСО, гарсаветам МОПР'у—3 ячэйкі МОПР'у, і гарсаветам „Бязбожнік" адна ячэйка бязбожніка. Зараз разгортваецца работа па ўцягненьні новых членаў у МОПР, Асоавіяхім, вядзецца збор сродкаў на карысьць палітзьняволеных. "І надалей замацуем нашы дасягненьні" — заявілі з трыбуны 5-й гарадзкой канфэрэнцыі дэлегаткі і хатнія гаспадыні.

А.

Тав. Базарэўская хатняя гаспадыня жакту № 12, актывістка яч-кі МОПР'у.

## Гарадзкому камітэту партыі і праўленьню Гаржылсаюзу

### РАПАРТ

работніц і хатніх гаспадынь 10-га раёну

Пад няўхільным кіраўніцтвам камуністыч ай партыі, шляхам ажыцьцяўленьня 6-ці ўмоў т. Сталіна, рабочая кляса атрымала вялізарнейшыя посьпехі на культурным і гаспадарчым фронце. Падняўся палітычны ўзровень жанчын, іх удзел у палітычных і гаспадарчых кампаніях.

Па 10 м раёне дэлегацкі пункт, якім ахоплена 18 жанчын, зьяўляецца актыўным удзельнікам ва ўсёй грамадзкай працы жактаў.

Праведзена вялікая работа па мабілізацыі сродкаў, у выніку чаго фінплян выканан на 90 проц., а па асобных жактах—на 110—119 проц.

Сабрана падпіскі на пазыку „3-ці рашаючы год пяцігодкі" на 5.000 р., дадатковая падпіска за наяўны разьлік дала 550 руб.

Дэлегацкі пункт цалкам зьяўляецца ўкладчыкам ашчадкасы і завербаваў сярод жыхароў жакту ўкладчыкаў на сумму 200 руб. Завербавана новых членаў жакту—93 чалавекі з паявымі ўзносамі на суму 558 р.

У карысьць МОПР'у сабрана 66 руб. і адпрацован суботнік, які даў 60 руб.

Мопраўскай ячэйкай ахоплена 300 чалавек, запазычанасьць па членскіх узносах ліквідавана на ўсе 100 проц. Ячэйка Асоавіяхіму налічвае 50 чалавек, распаўсюджана лётарэйных білетаў на 550 руб. Ячэйка „Бязбожнік" налічвае 60 чалавек, на падводную лодку сабрана 50 р. Нядаўна арганізавана ячэйка „Прыхільнік дзяцей", якая налічвае 35 членаў.

Мы і надалей абавязваемся прыняць самы актыўны ўдзел у дапамозе прыгараднай гаспадарцы ў правядзеньні 3-ай бальшавіцкай вясны, наладзіць добра вайсковую вучобу і выконваць усе абавязкі, ускладзеныя гаркомам партыі і гаржылсаюзам. Выклікаем на сацспаборніцтва 13 і 6 раёны.

### РАПАРТ

работніц і хатніх гаспадынь 15-га раёну

15 раён налічвае 14 жактаў. У выніку бальшавіцкай работы, пад непасрэдным кіраўніцтвам партыйнай ячэйкі, мы рапартуем 5 ай канфэрэнцыі гаржылсаюзу аб наступным:

Запазычанасьць па квартплаце ліквідавана на 100 проц. Пазыка „3-ці рашаючы" рэалізавана на 2.200 руб. і дадатковая падпіска складае 570 руб.

Праводзіцца праца па ліквідацыі няпісьменнасьці сярод хатніх гаспадынь і работніц. Апрача лікпункту практыкуюцца заняткі на даму. Такім чынам ліквідацыяй няпісьменнасьці ахоплена 100 проц. няпісьменных у ліку 50 асоб.

Рэгулярна праходзяць заняткі хэмкаманды, якую наведваюць 15 асоб. У пайшчыкі ўцягнута 50 новых асоб.

Ніводнага рубля запазычанасьці па квартплаце. Уцягненьне новых пайшчыкаў, поўнае выкананьне фінпляну, ніводнай няпісьменнай работніцы і хатняй гаспадыні, за культурную рэвалюцыю ў нашым быце. Пад гэтымі лёзунгамі мы абавязваемся праводзіць далей нашу працу.

# РАПАРТ

## РАБОТНІЦ ЗАВОДА „ПОЛЫМЯ РЭВАЛЮЦЫІ“ ПЛЕНУМУ МЕНСКАГА ГАРКОМУ КП(б)Б, ПРЫСЬВЕЧАНАМУ „8 САКАВІКА“

Вагонна-рамонтны завод „Полымя рэвалюцыі“ зараз поўнасьцю перайшоў на рамонт рухавога складу. У 1932 годзе перад заводам стаяць вялізарныя задачы па далейшым разгортваньні выпуску вагонаў як таварных, так і пасажырскіх. За гэты год мы павялічваем выпуск вагонаў на 100 проц., гэта значыць завод дасьць транспарту 3.870 таварных вагонаў і 459 пасажырскіх. Апрача гэтага павінны забясьпечыць усю МББ і яе абменныя пункты, даўшы прадукцыі на 5.025.707 руб. Гэта з усёй выразнасьцю паставіла пытаньне перад усімі заводзкімі арганізацыямі—мабілізаваць усіх рабочых заводу на выкананьне ўсіх гэтых задач на аснове рэалізацыі 6-ці ўмоў тав. Сталіна, пастаноў ЦК аб транспарце і загаду т. Андрэева. Размах работы на транспарце патрабуе ўцягненьня жанчын у вытворчасьць і, як вынік гэтага, сёньня на заводзе працуюць 133 работніцы замест 30 у першай палове 1931 году.

Мы рапартуем: з 130 работніц працуе на кваліфікаванай рабоце 84, балтарэзамі—8, прасоўшчыц—3, сьлесароў—11, маляроў—1, сталяроў—6, токараў—3, гайкарэзаў—3, сьвярлоўшчыц—14 і на іншай кваліфікаванай працы—35. Сярод работніц 113 ударніц, лепшыя з іх Пайуховіч, Бабіновіч, Белякоўская, Паміноўская, Дуброва, Баблёва і іншыя, якія перавыконваюць прамфінплян. У дзень 8-га сакавіка мы прэміявалі за ўдарную працу 15 ударніц. Пытаньне вучобы стала асноўным пытаньнем у працы. Мы ліквідавалі няпісьменнасьць. З работніц займаюцца ў лікунцкце 3, у партшколах—10, у тэхгурткох—7 і ў іншых вуч. пунктах—65.

8-га сакавіка падпісаліся дадаткова на пазыку на 100 руб.

Разам з гэтым мы маем і недахопы. Мы вельмі слаба вядзем працу па перадачы лепшых ударніц у партыю, з 133 работніц у партыі—8.

Мы ўпэўнены, што пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, яшчэ шчыльней згуртаваўшыся вакол яе ленінскіх радоў, цалкам ліквідуем недахопы, пакажам лепшыя прыклады змаганьня за здаровы вагон, за сацыялістычны транспарт.

## РАПАРТ РАБОТНІЦ Ф-КІ „КАМУНАРКА“

Падрыхтоўка да 1932 году прайшла пад знакам мабілізацыі ўсяго нашага рабочага калектыву на стварэньне рашучага пералому ў рабоце нашай фабрыкі. Пад кіраўніцтвам партыйнай арганізацыі мы гэтага пералому дабіліся: плян студзеня выкананна 90,4 проц., лютага—на 108,4 проц. 4-га сакавіка мы ліквідавалі датэрмінова студзеньскі прарыў у ліку 85 тон прадукцыі.

Работніцы нашай фабрыкі, якія складаюць асноўную частку ўсяго нашага калектыву, з гонарам рапартуюць гарадзкому камітэту наступнае:

На сёньешні дзень на фабрыцы налічваецца 651 работніца, з гэтага ліку маем 600 ударніц, якія замацаваліся за фабрыкай да канца пяцігодкі.

На кіруючую работу фабрыкі (гаспадарчую і грамадзкую) вылучана 29 работніц. На вышэйшай кваліфікацыі ў якасьці кіраўнікоў знаходзіцца 13 асоб.

Работніц—членаў партыі мы маем 57 чалавек, камсамолак—218 чалавек.

Гаспадарча-разрахунковых брыгад за першы квартал 1932 году арганізавана 10 з ахопам імі 111 чалавек. За гэты кароткі тэрмін свайго існаваньня гаспадарча-разрахунковыя брыгады маюць наступныя дасягненьні: выконваюць прамфінплян на 116 проц. (пры агульным выкананьні на 108,4 проц.), браку было 3 проц., зараз ён зьнізжан да 0,4 проц. Гаспадарча-разрахунковыя брыгады зьяўляюцца першымі па ліквідацыі няпісьменнасьці і па падняцьці тэхнічных ведаў і правядзеньні ў жыцьцё 6-ці ўмоў тав. Сталіна.

Да XIV зьезду КП(б)Б і XVII партканфэрэнцыі адкрыты ясьлі, якія пераходзяць на 3-зьменную працу.

Работніцы ўдзельнічаюць у розных вайсковых гурткох. У часе падрыхтоўкі да міжнароднага дня работніц падана 14 заяў у партыю. Сярод іх Асіпчук з 32-гадовым вытворчым стажам, Фітэрштэйн—з 12-гадовым вытворчым стажам, Шымковіч—з 8-гадовым вытворчым стажам; у камсамол уступіла 15 чалавек, арганізавана 7 гаспадарча-разрахунковых брыгад ліквідавана няпісьменнасьць 4-х чалавек, пераведзена ў вячэрнюю школу 12 чалавёк. Прэміявана лепшых ударніц 18 чалавек.

Наш рабочы, улічваючы прарывы, якія мы маем у галіне паляпшэньня якасьці прадукцыі, якаснага выкананьня прамфінпляну, далейшага яшчэ больш рашучага аўладаньня тэхнікай нашай вытворчасьці, пастаноўкі масава-выхаваўчай і інтэрнацыянальнай работы, правядзеньня ў жыцьцё 6 гістарычных умоў тав. Сталіна, пад кіраўніцтвам свайго партыйнага калектыву пераключыўся на ліквідацыю недахопаў, якія яшчэ ёсьць і запэўняе гарадзкі камітэт КП(б)Б, што будзе і надалей біцца за высокія бальшавіцкія тэмпы работы ва ўсіх галінах нашай вытворчасьці, тым самым забясьпечваючы выкананьне і перавыкананьне плянў 4-га заключнага году пяцігодкі.

**Няхай жыве КП(б)Б!**

Беняева—уборшчыца з-ду „Полымя“ Рэвалюцыі“. Прэміявана ў дзень 8-га сакавіка.

# ПРАТРУЧВАНЬНЕ НАСЕНЬНЯ

Ураджаі нашых збожжавых культур часта паніжаюцца ў вынку таго, што гэтыя культуры паражаюцца асобнай хваробай — галоўней, або сажай.

Сажа—гэта хвароба, якая паражае каласы, мяцёлкі або сьцяблы расьлін, ператвараючы іх у чорны пыл. Гэта хвароба паражае ўсе віды збожжавых культур: збожжа, пшаніцу, ячмень, авёс і проса. Страты ад сажы па некаторых калгасах дасягаюць 30 проц. і больш.

Сажа не дае коласу наліцца зернем, або зусім зьнішчае гэтае зерня і тым самым зьмяншае ўраджай.

Сажа збожжа і пшаніцы апрача таго яшчэ і псуе муку: яна надае гэтай муцэ пах селядцоў.

Калі пасеяць насеньне з сажаю, то з яго будуць вырастаць хворыя расьліны.

**Каб зьнішчыць сажу, трэба перад пасевам пратручваць насеньне.** Апрача пратручваньня ў справе барацьбы з сажай адыгрывае вялікую ролю **чыстагатунковае насеньне, правільныя тэрміны сяўбы, правільны севазварот, ўгнаеньне, правільны абмалот і хаваньне пасеўнага зерня.**

Згодна пастановы Наркамзему БССР **усе калгасы павінны поўнасьцю, на 100 проц. пратруціць насеньне,** якое будзе высявацца ў гэту веснавую кампанію.

**Пратручваньне насеньня можна рабіць фармалінам** (мокрае і поўсухое пратручваньне) **і атрутнымі парашкамі** (сухое пратручваньне).

Фармалін добра зьнішчае сажу аўса, ячменю і проса. Пратручваньне мокрым спосабам вялікай колькасьці насеньня лепш за ўсё рабіць так: пасеўнае насеньне тонкім пластом рассыпаецца на чыстую падлогу (ток).

Робяць раствор фармаліну (з разьліку 1 частку (літар) саракапроцантнага фармаліну на 300 частак (літраў) вады) і паліваюць насеньне гэтым растворам з апырсквальніка.

Насеньне пасьля апырскваньня добра перамешваецца і накрываецца мяшкамі або брэзэнтам на 2 гадзіны. Пасьля насеньне прасушваецца ў цяньку.

Пратручваць насеньне мокрым спосабам трэба за 3—4 дні да пасеву.

Фармалін трэба хаваць у цёплым памяшканьні, у шкляной пасудзіне, закрытай коркам і залітай воскам ці парафінам.

Поўсухое пратручваньне насеньня фармалінам праводзіцца для зьнішчэньня пыльнай сажы—аўса і цьвёрдай сажы—ячменю.

Для поўсухога пратручваньня бяруць таксама раствор фармаліну, але большай канцэнтрацыі, чым для мокрага пратручваньня: на кожны літар 40 процантнага фармаліну трэба браць ня 300, а толькі 80 літраў вады.

Само пратручваньне робіцца такім-жа спосабам, як ужо было сказана раней: насеньне для пасеву рассыпаецца такім пластом і апырскваецца растворам фармаліну. Насеньне таксама добра перамешваецца драўлянаю лапатаю, пасьля чаго накрываецца брэзэнтам або мяшкамі на дзьве гадзіны.

Гэтае пратручваньне робіцца не раней, як за 3—4 дні да пасеву.

Пры поўсухім спосабе пратручваньня амаль зусім адпадае затрата рабочай сілы па прасушваньні насеньня.

Адным кілёграмам фармаліну можна пратруціць 3 тоны аўса і 6 тон ячменю.

Пры сухім патручваньні насеньне апыльваецца хэмічнымі парашкамі (**парашком АБ**).

Пры пратручваньні парашком АБ трэба памятаць, што ён небясьпечны для жыцьця чалавека, і таму пры працы лепш надзяваць на галаву хустку або шапку, каб атрута не набівалася ў валасы, а на вочы шофэрскія акуляры. Пасьля працы рукі і твар трэба добра абмыць, а верхнюю вопратку—выбіваць на паветры.

С. К.

# Вывучым тэхніку вядзеньня тэхкультур

Раней, да Кастрычніцкай рэвалюцыі, ільнаводчая і канопляводчая гаспадарка была самым адсталым вучасткам сельскай гаспадаркі. У сучасны момант у нас, у Савецкім Саюзе, гэтыя тэхнічныя культуры атрымліваюць вялікую магчымасьць для свайго разьвіцьня на аснове будаўніцтва спэцыяльных саўгасаў і калгасаў.

З ростам і ўмацаваньнем саўгасаў і калгасаў ёсьць ужо база для мэханізацыі ўсіх прыёмаў вырошчваньня тэхнічных культур і апрацоўкі іх. У сучасны момант задача арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў, пастаўленая партыяй у цэнтр увагі сельскай гаспадаркі, неразрыўна зьвязана з павышэньнем ураджайнасьці, з укараненьнем агранамічнай навукі ў практыку буйных сацыялістычных гаспадарак.

**Уменьне скарыстаць дасягненьні агранавукі і тэхнікі, зьяўляецца** важнейшай задачай кожнай саўгасьніцы і калгасьніцы. Патрэбна здзначыць, што ўраджайнасьць тэхнічных культур у БССР вельмі малая і даходзіць у сярэднім да двух цэнтнэраў валакна з аднаго *га* плошчы.

**Наша задача дабіцца ў гэтым годзе павышэньня ўраджайнасьці тэхнічных культур ільну да 2,6 цэнтнэра валакна, канапель 4,1 цэнтнэра з аднаго *га* плошчы.**

Да веснавой пасеўнай кампаніі кожная калгасьніца і саўгасьніца павінна вывучыць тэхніку вядзеньня ільнаканапляводчай сацыялістычнай гаспадаркі.

**У кожным калгасе і саўгасе павінны быць арганізаваны тэхгурткі па вывучэньні мерапрыемстваў вядзеньня тэхнічных культур.** У якасьці кіраўнікоў павінны быць прыцягнуты аграномы, настаўнікі ШКМ паляводы саўгасаў і калгасаў,

Часопісь „Работніца і калгасьніца Беларусі, пачынаючы з дзесятага нумару зьмесьціць на сваіх старонках матар'ял, патрэбны для заняткаў такога завочнага гуртка.

М.

## ПАРАДЫ ДОКТАРА

# Адзежная вош

На скуры чалавека адзежная вош не размнажаецца, а накіроўваецца туды толькі для жыўленьня. Яе пастаянным месцам зьяўляецца вопратка і нацельная бялізна, асабліва ў тых мясцох, дзе ёсьць складкі, якія цесна прылягаюць да цела. Такім месцам і зьяўляюцца складкі рубашкі вакол шыі, на жываце і інш. У гэтых мясцох самка кладзе свае яйкі (гніды), якія яна моцна прыклейвае да матэрыі.

Размнажаецца вош вельмі шпарка. Самка адкладвае за адзін раз каля 75 яек, з якіх праз некалькі тыдняў выходзяць маленькія вошы. Маладыя вошы ўжо праз два-тры тыдні здольны ў сваю чаргу адкладваць яйкі і таму зразумела, якіх разьмераў можа дасягнуць вашывасьць, калі з ёю не змагацца. З прычыны таго, што галоўным месцам размнажэньня вошай зьяўляецца нацельная бялізна, то людзі, якія не зьмяняюць доўга бялізны, хутка вашывеюць. Калі чалавек чысты і сочыць за сабою і сваёй бялізнай, не заношвае яе, то ён ніколі ня будзе вашывым.

На месцы ўкусу вошы ствараецца пузырок, які вельмі моцна сьвярбіць.

Пры чуханьні да крыві скура вельмі лёгка забрудняецца мікробамі, якія выклікаюць запаленьні і нагнаеньні скуры. Таму ў вашывых вельмі часта на скуры бываюць нарывы і струпы.

Улюбёным мэтадам для ўкусу вошай зьяўляецца ьп іна паміж лапатак, паясьніца, жывот, ягадзіцы клубы, г. зн. усе тыя месцы, дзе бялізна цесна прылягае да цела і дзе, значыць, вошы лягчэй за ўсё пералазяць на скуру.

Калі сярод людзей, якія церпяць ад вашывасьці, зьяўляецца сыпны тыфус, то ён вельмі лёгка і хутка пашыраецца і ад гэтага захворвае шмат людзей. Наадварот, там, дзе вошай няма, гэта хвароба не пашыраецца.

У больніцах, дзе хворыя трымаюцца ў чыстаце, дзе іх пры паступленьні добра мыюць, стрыгуць і зьмяняюць усю бялізну, там пэрсанал ніколі не заражаецца сыпным тыфусам. У тых-жа бальніцах, дзе хворыя ўтрымліваюцца ня зусім чыста, там магчымы захворваньні пэрсаналу.

Якія-ж меры трэба прымаць для змаганьня з вашывасьцю? Перш за ўсё трэба, вядома, трымаць сябе ў чыстаце, г. зн. хадзіць у лазьню не радзей двух раз у месяц і зьмяняць бялізну не радзей аднаго разу ў 7—10 дзён. Потым пры мыцьці бялізны яе заўсёды трэба варыць, бо толькі такім шляхам забіваюцца гніды. Калі завяліся гніды ня толькі ў бялізьне, але і ў вопратцы, то трэба яе грунтоўна папрасаваць гарачым уцюгам. Добра таксама правесьці акурваньне вопраткі серкай. Для акурваньня вопраткі можна выкарыстаць любы маленькі пакоік, каморку ці зямлянку, калі толькі сьцены даволі шчыльныя і не прапускаюць паветра.

Асаблівае значэньне набывае змаганьне з вошамі ў ваенны час, калі шмат людзей (вайсковыя часьці, бежанцы) вымушаны шпарка рабіць пераходы і пераезды на вялікія адлегласьці і часта пазбаўлены магчымасьці карыстацца лазьнямі і зьмяняць бялізну.

Доктар **Розэнталь.**

## Што зроблена па допісах рабселькорак

### Зьменена кіраўніцтва калгасу „Чырвоны Клешаў".

Допіс селькоркі „Выканаць доўг перад дзяржавай" аб тым, што ў калгасе „Чырвоны Клешаў", Мусіцкага сельсавету (Слуцкі раён), збожжа і ільновалакно злосна разбазарваецца, у той час, як загатоўкі ня выконваюцца, пацьвердзіўся Слуцкі РК КП(б)Б паведамляе, што **старшыня калгасу „Чырвоны Клешаў" зьнят з працы.** Па апрацоўцы ільну былі арганізаваны сталыя брыгады, вылучаны адказныя брыгадзіры.

**Пяць заможных гаспадарак, якія схаваліся ў калгас ад загатовак** (ураджай быў зьнят індывідуальна) вычышчаны з калгасу. Наладжан выпуск насьценнай штодзенкі.

### Дворына з працы зьнялі за самаснабжэньне

Факты ў допісу селькоркі аб тым, што ў Калодзішчанскім сельпо (Менскі раён) загадчык Дворын займаўся самаснабжэньнем, цалкам адпавядаюць сапраўднасьці. **Старшыня Сельпо Дворын з працы зьнят,** справа перадана ў парткалегію для прыцягненьня яго да адказнасьці ў парт-парадку.


ЗДАВАЙЦЕ

ПАДПІСКУ НА ЧАСОПІСЬ

**РАБОТНІЦА і КАЛГАСЬНІЦА БЕЛАРУСІ**

ЧАСОПІСЬ ВЫХОДЗІЦЬ 3 РАЗЫ Ў МЕСЯЦ

АДРАС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, САВЕЦКАЯ 63, 3-І ПАВЕРХ, ПАКОЙ № 11.



Выданьне ЦК КП(б)Б — Рэдактар Э. ШАПІРА

Друкарня імя Сталіна — Заказ № 645 — У ліку 13.400 экз. — Галоўлітбел № 390

Цана асобнага нумару 10 кап.

# СТАРОНКА РУЧНОЙ ПРАЦЫ

Вышыўка строчкай і вузялкамі. Вузор для дзіцячага фартучка



Форма выкрайкі дзіцячага фартучка



Вышыўка рэшыльле для сарочкі ці на вуглы сарвэты.

Жабу можна вышываць строчкай ці рабіць аплікацыю (нашываць з ласкуткоў матар'ялу). Вузор для дзіцячага фартучка